незалежная газета

№ 43 (689) 17 лістапада 2010

www.nn.by

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я   Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Е Т А

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Калі сыдзе Лукашэнка**

Старонка 9



**Супрацоўнік «Альфы» забіў амонаўца**

Старонка 6



**Яны яшчэ і пішуць**

Старонка 13

## У НУМАРЫ

**Прыбытак інтэрнэт-грашыма? Заблакаваць!**
Блакуюць карыстальнікаў інтэрнэт-кашалькоў. **Старонка 4.**

**Шапіра ініцыяваў беларусізацыю**
Старшыня Гродзенскага аблвыканкама пачаў весці нарады па-беларуску. **Старонка 5.**

**Смерць у клубе**
«Чалавек нападпітку можа загінуць дзе заўгодна». **Старонка 6.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**

# Апазіцыя на тэлебачанні

### Выступы пачнуцца з 22 лістапада.

Адразу пасля рэгістрацыі кандыдатаў, што пройдзе 18 лістапада ў Палацы Рэспублікі, адбудзецца лёсаванне, у час якога будзе вызначана, калі выступіць кожны з кандыдатаў.

Вядома, што першыя запісы адбудуцца ўжо на гэтым тыдні, а ў эфір пойдуць 22 лістапада. Па тэлебачанні кандыдаты будуць выступаць ад 19.00 да 20.00. А вось на радыё — а 6-й раніцы.

Найбольш пашанцуе тым кандыдатам, якія будуць выступаць першымі. Бо пасля ўвага людзей прытупіцца, дый цікавасць можа знікнуць.

На мінулых выбарах здаралася, што кандыдат прыходзіў на запіс не зусім падрыхтаваным. Кіраўнік штаба Рыгора Кастусёва Аляксей Янукевіч кажа, што прамова ўжо амаль падрыхтаваная.

«У першай частцы будзем гаварыць, за што мы выступаем, дзеля чаго гэта ўсё ўвогуле робіцца. У другой — ацэнка існуючай сітуацыі. У трэцяй — нашае бачанне, як зрабіць лепш. У чацвёртай — што трэба рабіць людзям», — кажа А.Янукевіч.

**Зміцер Панкавец**

### Выбар-2010

• **«Европейская проституция в действии».** Заява Грыбаўскайце шакавала некаторых апазіцыянераў.
**Старонка 2.**

•Расія падтасоўвае сацапытанні, каб скінуць Лукашэнку? **Старонка 3.**

• **Віціс Юрконіс: У Літве асцерагаюцца,** што апазіцыя пад уплывам Масквы.

• **Рымашэўскі абяцае разабрацца з карупцыяй.** Кандыдат у прэзідэнты прапануе ўвядзенне «правіла Лінкальна».

• **Мілінкевіч:** Маскве трэба чалавек, які цалкам здасць Беларусь.
**Старонка 8.**

• **Някляеў і Саннікаў дамовіліся** супрацоўнічаць, але не здымацца.
**Старонка 9.**




## Першы фільм, дзе паны гавораць па-беларуску

«Масакра» выйшла на экраны кінатэатраў. **Старонка 10.**

ВАРВАРСТВА

## Дык хто дазволіў ацыбуліць царкву ў Наваградку?

### Навагрудскі райвыканкам гаворыць пра дазвол ад Мінкульта. У міністэрстве кажуць, што дакумент яшчэ рыхтуецца.

На мінулым тыдні ў Навагрудку на царкве Барыса і Глеба ўсталявалі пазалочаныя цыбулепадобныя купалы. Пры гэтым былі дэмантаваныя шатровыя завяршэнні вежаў царквы. Старшыня Таварыства аховы помнікаў Антон Астаповіч адрэагаваў на гэта зваротам у Міністэрства культуры з просьбай спыніць працы ў Навагрудку і прыцягнуць да адказнасці вінаватых у парушэнні заканадаўства.

**Працяг на старонцы 5**



**У інтэрнэце з'явіліся сатырычныя калажы з нагоды «ацыбульвання» царквы ў Навагрудку.**



КАМЕНТАР

## «Европейская проституция в действии»

### Заява Грыбаўскайце шакавала некаторых апазіцыянераў.

Еўрасаюз на гэтых выбарах маўкліва падтрымлівае Лукашэнку? Многае пра тое сведчыла. Новым доказам таго стаў выцек інфармацыі пра выказванні прэзідэнта Літвы Далі Грыбаўскайце перад пасламі краін Еўрасаюза **(старонка 8)**.

Грыбаўскайце патлумачыла і прычыны такой падтрымкі. На яе думку, «Лукашэнка — гарант незалежнасці» Беларусі. Захаванне рэжыму Лукашэнкі, хоць гэта і дыктатура, усё ж лепшы выхад, чым пашырэнне ўплыву Расіі. Апазіцыя, тым часам, несур'ёзная і не мае шанцаў, — так быццам бы заявіла Грыбаўскайце на закрытай сустрэчы.

Для часткі апазіцыі гэта стала шокам. Як у люстэрку фрустрацыя адбілася ў каментарах на апазіцыйным сайце Charter97.org.

«Европейская политическая проституция в действии», — піша ў сваім каменце чытач пад нікам «внимательный».

«Политическая проститутка, литовцам надо задуматься, кто у них президент», — піша другі.

Многія каментатары не разумеюць, што гэта пазіцыя ўсяго Еўрасаюза, Захаду як такога, а не толькі Літвы, і таму лаюць: «Лишний раз подтверждает, что жмудам нельзя доверять. Как машину купить в Вильне на рынке — 100% попандос!»

Некаторыя каментатары спадзяюцца, што пазіцыя ЗША ў дачыненні да беларускага аўтакрата будзе адрознай: «Боже, храни Америку!» — піша Грыша.

«Оба-на, мозаика передается через рукопожатие!» — жартуе ahtoyta.

### «Мазаіка перадаецца праз поціск рук!»

Ні ў аднаго з каментатараў няма разумення, што расчараванне апазіцыяй тлумачыцца ліслівым фліртам часткі яе лідараў з Расіяй і няздольнасцю выпрацаваць рэалістычную праграму дзеянняў.

А вось прарасійскія галасы гучаць выразна: «Вот вам, сябры, и истинный лик Запада. От России у всех щиколотки трясутся. И трястись будут — веками!!!» — усклікае «Ветеран».

На Маскву спадзяецца і «Калинар»: «Вот еще один серьезный повод для Кремля запрессовать Луку вместе с его братвой в трубопровод «Дружба» всем составом, за мошенничество и предательство. Мы все здесь только за!»

А як жа тыя, хто супраць ці ўстрымаўся? Хто не хоча, каб беларускія брыкеты фармаваў крамлёўскі прэс? Хто верыць у разумнасць палітыкі «ўцягвання Лукашэнкі ў Еўропу»?

Каментароў з разуменнем ці падтрымкай пазіцыі Грыбаўскайце на Charter97.org няма, ці то яны цэнзуруюцца.

«В новой Беларуси нужно всех этих кускуриц и грибаскайте сделать персонами нон грата, нечего всякому быдлу сюда приезжать», — грыміць «Виталь», нібы яму трэба даказаць думку Грыбаўскайце пра несур'ёзнасць апазіцыі ў Беларусі.

Толькі адзінкавыя каментатары ацэньваюць стан рэчаў цвяроза: «Первая реакция — разбить комп. за такие новости. Остыл. Сами и только сами. Надеяться надо только на себя!» — піша «Серый».

**Андрэй Дынько**



16 лістапада мусульмане пачалі святкаванне Курбан-Байрама. У беларускіх мусульман гэтае найбольшае свята ў сваіх праявах нагадвае хрысціянскі Вялікдзень. На фота: у мячэці Іўя.

## Сцісла

• **МВФ: Банкруцтва Беларусі не пагражае.** Аднак у Міжнароднага валютнага фонду захоўваецца занепакоенасць адносна таго, што Беларусь моцна залежыць ад іншых краін і замежных рынкаў. Пра гэта заявіў кіраўнік місіі МВФ у Беларусі Крыстафер Джарвіс 16 лістапада на брыфінгу ў Мінску. Першачарговай задачай МВФ бачыць дэфіцыт замежнага гандлю. Апошнія гады імпарт стабільна перавышаў экспарт. МВФ разгледзіць новыя запыты Беларусі ў студзені, пасля прэзідэнцкіх выбараў.

• **Даляр устанавіў новы рэкорд — 3038 рублёў.** Курс еўра на сераду складае 4131. Каэфіцыент еўра/даляр трымаецца на ўзроўні 1,36.

• **Тайланд выдаў Бута ў ЗША.** Расійскі гандляр зброяй Віктар Бут быў арыштаваны ў Бангкоку ў 2008 годзе ў выніку супольнай аперацыі спецслужбаў. Не выключана, што ён рабіў махінацыі і з беларускай зброяй. Сам Бут сваю віну адмаўляе.

• **«Кухня» АНТ згадала апазіцыйных кандыдатаў.** Сатырычная праграма абгаворвала Лукашэнку, Саннікава і Някляева.

• **У Мінску ў нядзелю пабіты тэмпературны рэкорд.** Слупок тэрмометра ў сталіцы падняўся да адзнакі плюс 13,3°С. Ранейшы рэкорд складаў +11,7°С і быў устаноўлены ў 2000 годзе. Адхіленне сярэднесутачнай тэмпературы ад нормы склала амаль 9°С.

• **Цяплей за ўсё ў панядзелак было ў Лельчыцах — +18,5°С.** Гэта новы рэкорд дня для райцэнтра (было 15,6 у 2000 годзе) і ўсёй краіны (16,9°С у Пінску таксама ў 2000 годзе).

• **У найбліжэйшыя дні ў Беларусі захаваецца сырое і цёплае надвор'е.** Тэмпература паветра ноччу +1–8, днём +5–11°С, на паўднёвым усходзе да +14°С.

• **Дзверы адчыняюцца?** У Віленскам цэнтры сучаснага мастацтва 18 лістапада пачынае працу выстава «Дзверы адчыняюцца? Беларускае мастацтва сёння». Арганізатары ласкава запрашаюць на экспазіцыю, а таксама на дыскусію з аўтарамі працаў (19 лістапада) і даследчыкамі ды крытыкамі сучаснага мастацтва (20 лістапада). Выстава будзе працаваць да 9 студзеня 2011.

**МБ; БелаПАН**




### Самае чытанае на nn.by за 10 — 16 лістапада

- На навагрудскай царкве Барыса і Глеба ўсталёўваюць «цыбуліны»
- Жорсткая антылукашэнкаўская прапаганда ў інтэрнэце
- У каментатараў Charter97.org фру-страцыя пасля заявы Грыбаўскайце
- Найлепшы здымак у конкурсе National Geographic зрабіў фатограф з Беларусі
- «Вместе заменим его портреты»
- Рыхтуецца эратычны «Сучасны беларускі каляндар». З пісьменніцамі
- Някляеў і Саннікаў дамовіліся
- Шапіра ініцыяваў беларусізацыю
- ЦВК: 10 кандыдатаў адолелі 100-тысячны бар'ер
- Грыбаўскайце хоча, каб перамог Лукашэнка

### nn@nn.by

Глабальнага пацяплення
не існуе, не існуе, не існуе —
і так да моманту, пакуль мозг
не закіпіць.

**Міхаліна**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

### Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 4 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

**Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.**

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazu дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты:**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

### Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

**Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»:** для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

### Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Д.М., Уладзіміру Г., І.М., Сяргею М., Л.Ш., А.Р. з Мінска.
Змітру П. з Мінскага раёна.
Т.К. з Смалявіцкага раёна.
Святлане Ш., Уладзіславу Г. з Віцебска.
М.Б. з Полацка.
А.С. з Мазырскага раёна.
Лілі Л. з Маладзечанскага раёна.
Міхалу К. з Рэчыцкага раёна.
Аксане Д. з Пінскага раёна.
П.К. з Мастоўскага раёна.
А.П. з Брэста.

# Расія падтасоўвае сацапытанні, каб скінуць Лукашэнку?

На мінулым тыдні расійскі сайт Regnum надрукаваў вынікі сацыялагічнага апытання наконт прыхільнасцяў беларускіх выбарцаў.

Паводле вынікаў апытання, за Аляксандра Лукашэнку гатовы прагаласаваць толькі 31% грамадзянаў. За ягоных супернікаў Уладзіміра Някляева і Андрэя Саннікава — адпаведна, 11,2 і 9,8%.

Апытанне быццам бы праводзіў маскоўскі цэнтр «Соцыум». Цікава, што на іхнім сайце няма ніякіх кантактаў. А папярэдняе апытанне было праведзенае аж у маі 2009 года. Апытвалі крымскую моладзь, ці падтрымлівае яна дэпартацыю мясцовых татараў у 1944-м. Большасць адказала, што так.

Нягледзячы на невядомасць сацыялагічнай службы, лічбы рэйтынгу беларускіх кандыдатаў хутка падхапілі вядучыя расійскія СМІ. Прынамсі, яны фігуравалі ў сюжэце тэлеканала НТВ.

Вядомы беларускі сацыёлаг Андрэй Вардамацкі кажа, што ніколі не сутыкаўся з «Соцыумам». «Не чуў пра іх. Спачатку думаў, што гэта ўкраінскі «Соцыс», аж не», — кажа А.Вардамацкі.

На думку сацыёлага, правесці такое апытанне ў Беларусі тэарэтычна магчыма, але вельмі цяжка. «Пытанне найперш не ў фінансах, а ў кваліфікацыі кадраў, якасці працы. Так лёгка гэта не зробіш», — мяркуе кіраўнік аналітычнага цэнтра «Новак».

Характэрна, які сайт першым паведаміў пра вынікі апытання. Regnum мае рэпутацыю рупара Крамля ў справах краін былога СССР. У беларускай рэдакцыі працуюць людзі, што выступаюць за аб'яднанне з Расіяй, але без Лукашэнкі.

Правесці сацыялагічнае апытанне ў Беларусі — нялёгкая справа. За часамі Лукашэнкі незалежныя сацыёлагі трапілі пад прэс. Сетку кадраў маюць толькі некалькі службаў. Цяжка паверыць, што нехта з нуля, не маючы пэўнай базы ў Беларусі, можа даць аб'ектыўныя вынікі.

Выглядае на тое, што Масква адмыслова ідзе на падтасоўку апытанняў, каб мець лішні аргумент у барацьбе з Лукашэнкам.

Зрэшты, ужо праз пару дзён «адэкватны» адказ «Соцыуму» дала лукашэнкаўская служба Ecoom. Паводле іх звестак, у перамозе Лукашэнкі перакананыя 83% апытаных. Сацыялагічная вайна робатаў.

**Зміцер Панкавец**

# У арміі служым паўтара года, а на падаткі працуем шаснаццаць

### Аналітыкі падлічылі індэкс дабрабыту.

Аналітычны цэнтр «Стратэгія» прэзентаваў вынікі чарговага даследавання «Іванаўна». У яго аснове знаходзіцца ацэнка колькасці часу, які трэба адпрацаваць, каб на атрыманыя грошы набыць пэўны тавар. У кошыку 35 тавараў і паслуг — ад хлеба да кватэры.

Папярэдні выпуск індэкса датаваўся 2005-м годам. Па ўсіх паказчыках бачна — за пяць год беларусы сталі жыць лепш. Але дабрабыт суседзяў расце яшчэ хутчэй.

Што канкрэтна змянілася за пяцігодку? У 2010 годзе для куплі 35 тавараў і паслуг трэ было адпрацаваць 19 гадоў, у той час як у 2005 годзе для пакупкі такога ж набору давялося б працаваць 33 гады.

### Сярэдні беларус жыве ў паўтара разу горш, чым сярэдні паляк.

Калі б зарплата беларуса ўсё жыццё была на ўзроўні цяперашняй, то за 40 гадоў ён зарабіў бы $187 200. Але пры існуючым ўзроўні падаткаў беларус на працягу жыцця вярнуў бы дзяржаве каля $75 000. Такім чынам, каб разлічыцца з дзяржавай па падатках, беларусу трэба працаваць 16 гадоў.

Паляк, каб назбіраць грошы на куплю тых самых тавараў, траціць на 11 гадоў менш, чым беларус.

З расіянамі сітуацыя неадназначная. Яны маюць нашмат даражэйшыя цэны на кватэры і грамадскі транспарт, затое меншыя цэны па ўсіх іншых паказчыках.

Нягледзячы на ўсе высілкі, постсацыялістычныя краіны ўсё яшчэ далёкія ад узроўню дабрабыту ЗША нават у 1990 годзе.

**Яўген Васількоў**

**Колькі трэба працаваць, каб купіць тавары і паслугі?***

| Тавар | Беларусь 2010 | Беларусь 2005 | Расія 2010 | Польшча 2010 |
|---|---|---|---|---|
| Чорны хлеб, 1 кг | 7,4 | 12,8 | 4 | 10 |
| Свініна, 1 кг | 118 | 215 | 73 | 27 |
| Малако, 1 літр | 12,3 | 14 | 15 | 6 |
| Абед у кафэ сярэдняга класа, у гадзінах | 6 | 7,5 | 4,3 | 1,3 |
| Шакалад, 100 гр | 32 | 46 | 19 | 8 |
| Пральны парашок Ariel, 1 кг | 47 | 73 | 28 | 13 |
| Касцюм мужчынскі, у гадзінах | 86 | 122 | 56 | 17 |
| Боты жаночыя, у гадзінах | 49 | 69 | 29,5 | 10,5 |
| Тэлевізар Sony (54 см), у гадзінах | 111 | 206 | 66 | 27 |
| Кватэра 60 м² у сталіцы, у гадах | 14,1 | 23,9 | 19 | 6,5 |
| Пральная машына Bosch, у месяцах | 1 | 2,4 | 0,8 | 0,3 |
| Вышэйшая адукацыя, у гадах | 1,3 | 2 | 1,17 | 0,5 |
| Квартплата (кватэра 60 м², сям'я з 4–х чалавек, ацяпляльны сезон), у гадзінах | 25 | 38 | 22 | 15 |
| Інтэрнэт, 1 гадзіна | 5 | 64 | 3 | 0,3 |
| Грамадскі транспарт, 1 паездка | 5,7 | 17,4 | 10 | 5 |
| **Агулам па 35 таварах і паслугах** | **19,3 года** | **33 гады** | **22,9 года** | **8,6 года** |

*(у хвілінах, калі не пазначана іншае)


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Ярмошына паведаміла, хто жонка Лукашэнкі

### Кіраўнік дзяржавы падаў дзве дэкларацыі: на сябе і на Галіну Радзівонаўну.

Звесткі аб прыбытках і маёмасці кандыдатаў у прэзідэнты будуць агучаныя падчас іх рэгістрацыі на пасяджэнні Цэнтрвыбаркама. Яно запланаванае на 18 лістапада.

Дакументы аб прыбытках і маёмасці ўсіх адзінаццаці патэнцыйных кандыдатаў накіраваныя на разгляд у ЦВК. Прэтэндэнты падалі дэкларацыі аб прыбытках і маёмасці на сябе, а таксама на жонак і паўналетніх сваякоў, якія жывуць разам з імі і разам вядуць гаспадарку.

«Пакуль кандыдат не зарэгістраваны, ён з'яўляецца прыватнай асобай. І звесткі пра ягоныя прыбыткі не падлягаюць апублікаванню. І калі ён будзе зарэгістраваны, мы ўсё апублікуем у СМІ па кожным з іх», — паведаміла старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына карэспандэнту радыё «Свабода».

Аднак Аляксандр Лукашэнка — не проста прыватная асоба, а яшчэ і дзяржаўная. Паводле спадарыні Ярмошынай, тым не менш «як прэзідэнт ён не абавязаны публікаваць гэтыя дадзеныя». Маўляў, нельга патрабаваць ад яе агалошваць тое, што яна «не мае права агалошваць».

**Прыбытак Раманчука 500 тысяч у месяц**

Кандыдат ад Партыі БНФ Рыгор Кастусёў за апошні год зарабіў 200 тысяч расійскіх рублёў (гэта каля 20 мільёнаў нашых). Кастусёў працуе ў будаўнічай фірме намеснікам дырэктара.

Даходы Уладзіміра Някляева склалі 16 мільёнаў. Іх ён зарабіў найперш як паэт. Гэта ганарары за ягоныя вершы і песні.

У Віталя Рымашэўскага месячны прыбытак складае троху больш за мільён. А вось у вядомага эканаміста Яраслава Раманчука крыху болей за 500 тысяч.

**ЗП**

А якія дакументы падаваў Аляксандр Лукашэнка апроч сваёй дэкларацыі? На гэта Лідзія Ярмошына сказала: «Ён падаў дэкларацыю сваёй жонкі. Як і належыць». На пытанне карэспандэнта, хто з'яўляецца жонкай Аляксандра Лукашэнкі, Ярмошына адказала: «Гэта Лукашэнка Галіна Радзівонаўна».

Паводле старшыні ЦВК, Лукашэнка не падаваў дэкларацыі на маці, бо яна, «відаць, з ім разам не пражывае». Між тым, хадзілі чуткі, што Лукашэнка, перавёзшы маці ў Мінск з Александрыі, спачатку пасяліў яе ў дамку на праспекце Пераможцаў, а потым забраў да сябе ў Дразды. Таксама няма дэкларацый і на ягоных дзяцей, бо яны «пражываюць асобна, гэта асобныя сем'і, і гэта цяпер не патрабуецца».

Апошні раз кіраўнік дзяржавы падаваў дэкларацыю перад выбарамі 2006 года. Паводле сведчанняў Лукашэнкі, за той год ён зарабіў трохі болей за 59 млн рублёў (каля 30 тысяч даляраў па тагачасным курсе). Таксама ў той дэкларацыі была пазначаная наяўнасць толькі двух сыноў — Віктара і Дзмітрыя. Пра трэцяга сына — Мікалая — згадана не было.

На пытанне, у каго з сёлетніх кандыдатаў найбольшыя, а ў каго найменшыя прыбыткі, спадарыня Ярмошына сказала: «Я гэтага не памятаю. Але магу сказаць, што частка патэнцыйных кандыдатаў наогул не мае ніякіх прыбыткаў».

**СМ**

# Еўракамісія прапануе Беларусі змякчэнне візавага рэжыму

### 15 лістапада Мінск наведаў еўракамісар Штэфан Фюле.

Гэта другі візіт чыноўніка ў нашу краіну. Упершыню Фюле прыязджаў у ліпені.

Гэтым разам еўракамісар не сустракаўся з кандыдатамі ў прэзідэнты. Раніцай у яго было спатканне з прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці. У гатэлі «Еўропа» было больш за пяцьдзясят чалавек.

Пасля Фюле даў прэс-канферэнцыю. Ён паведаміў, што краіны ЕС абмяркоўваюць сумесны прамежкавы план адносна Беларусі.

Гэты план змяшчае і пытанне змякчэння візавага рэжыму для грамадзян Беларусі. Перамовы пачаліся. Рашэнне не будзе залежаць ад палітычнай сітуацыі ў краіне.

Зніжэнне коштаў візаў можна разглядаць як падтрымку беларускага кіраўніцтва перад выбарамі.

**ЗП**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Штэфан Фюле (злева) і Сяргей Мартынаў.**

## Сцісла

• **Новы пасол Польшчы прыбудзе ў Беларусь хутчэй за ўсё ў студзені.** Паводле паведамленняў польскіх СМІ, пасольства ў Беларусі узначаліць Марак Зюлкоўскі — дырэктар дэпартамента супрацоўніцтва пры МЗС Польшчы, які раней працаваў паслом ва Украіне, а ў 1991—1992 гг. консулам у Мінску.

• **Мінюст устаў на бок Ляўковіча.** З'езд БСДП, на якім таго пераабралі, прызнаны нелегітымным. Як вядома, 10 кастрычніка замест Анатоля Ляўковіча арганізацыю ўзначаліў Анатоль Сідарэвіч. Менавіта былы старшыня і падаў скаргу ў Мінюст.

• **«Рух наперад» усё ж зліквідавалі.** Суд прызнаў несапраўднасць арэнды паміж «Рухам наперад» і кампаніяй «Ціна Влаці». Гэтага аказалася дастаткова для ліквідацыі. У межах «Руху наперад» дзейнічае кампанія «Гавары праўду».

**ЗП**

# Беларусь і Расія рыхтуюцца да нафтавай вайны

Тэрмін дзеяння ранейшага пагаднення канчаецца 31 снежня.

Нафтавая вайна можа паўтарыцца. Тэрмін дзеяння пагаднення аб гандлі нафтай, падпісанага 27 студзеня 2010 года, канчаецца 31 снежня гэтага года. Бакі не дасягнулі прагрэсу ў новым вырашэнні праблемы, паведамляе блізкае да Адміністрацыі прэзідэнта і спецслужбаў інфармацыйнае агенцтва «Інтэрфакс». Пакуль што пытанне не паднімалася да ўзроўню кіраўнікоў краін. Якіх жа пазіцый трымаюцца перамоўшчыкі?

### Беларусь прывыкла

Нагадаем, што цяперашняя сітуацыя выглядае так: Расія пастаўляе Беларусі 6,3 мільёна тон бязмытнай нафты. За кошт гэтага наша краіна атрымлівае своеасаблівую субсідыю ў памеры $1,8 мільярда. Мыты за астатнія аб'ёмы нафты выплачваюцца ў поўным аб'ёме.

На пачатку года Беларусь шумна пратэставала, што і стала прычынай канфлікту. Цяпер жа Мінск палічыў бы за шчасце захаванне існуючага парадку. З адной маленькай папраўкай. Віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка хацеў бы павялічыць бязмытавую квоту на 0,4 млн т, да 6,7 млн.

### Забраць апошнюю кашулю?

Прапанова расіянаў больш складаная, бо складаецца з двух этапаў выплат. Намеснік міністра фінансаў Расіі Сяргей Шаталаў прапанаваў замяніць мыты на нафту для Беларусі экспартнымі мытамі на беларускія нафтапрадукты, якія будуць перадавацца ў расійскі бюджэт.

Пры такім варыянце мыты на нафту для нашай краіны знікаюць цалкам, Беларусь больш не мае праблемы з загружанасцю нафтаперапрацоўчых заводаў, але будзе вымушаная дзяліцца пасля, калі прадасць тавары за мяжу.

Расіяне хочуць атрымліваць мыты ад экспарту нафтапрадуктаў з любой іншай нафты, апроч венесуэльскай. Нават з нафты, здабыванай у Беларусі! Тады для Беларусі згубіцца ўся прывабнасць нафтаперапрацоўкі.

Як паведамляла крыніца «Інтэрфаксу», «беларускі бок згодны перадаваць у расійскі бюджэт толькі вывазныя мыты ад экспарту нафтапрадуктаў, вырабленых з расійскай нафты».

### Кампраміс на чыіх умовах?

Іншая расійская газета, «Камерсант», на наступны дзень, 11 лістапада, выказвала меркаванне, што бакі ўсё ж прыйшлі да кампрамісу. Дырэктар дэпартамента падатковай і мытнатарыфнай палітыкі Міністэрства фінансаў Расіі Ільля Трунін растлумачыў выданню, што «беларусы згадзіліся пералічваць любое мыта на экспарт нафтапрадуктаў, якое будзе ўсталявана расійскім заканадаўствам».

Чаму мыта будзе павялічанае? Калі пакінуць старое, то Беларусь зможа зарабляць і па новай схеме. Прыблізны прыбытак мог складаць $2 мільярды. Цяпер Расія хоча ўраўнаважыць сітуацыю, каб, з аднаго боку, мінімізаваць беларускую выгаду, але з іншага — не задушыць нафтаперапрацоўку нашай краіны.

### Адкладзены запас

У адрозненне ад папярэдняга канфлікту, цяпер Беларусь мае падстрахоўку на час доўгіх перамоваў у выглядзе нафты з Венесуэлы. Нафтаперапрацоўчыя заводы ў Мазыры і Наваполацку на час перамоваў будуць уратаваныя ад спынення.

З іншага боку, сітуацыя пагаршаецца тым, што з 1 студзеня ўвойдзе ў дзеянне ў пробным рэжыме нафтаправод БТС-2 у абыход Беларусі. Значыцца, Расія перастане быць залежнаю ад беларускага транзіту. І ў перспектыве можа зусім адмовіцца ад транзіту нафты праз Беларусь.

Між тым, у 2009 годзе праз сістэму магістральных нафтаправодаў «Дружба» праз Беларусь прапампавалі амаль 80 мільёнаў тон нафты. Гэта было адной з важных крыніц даходу нацыянальнага бюджэту.

**Яўген Васількоў, Мікола Бугай**

**Чысты прыбытак Беларусі на імпарце/экспарце нафты і нафтапрадуктаў**

| | |
|---|---|
| 2004 | $130 мільёнаў |
| 2005 | $950 мільёнаў |
| 2006 | $1,13 мільярда |
| 2007 | $450 мільёнаў |
| 2008 | $875 мільёнаў |
| 2009 | $−1,38 мільярда |

# У Беларусі змагаюцца з тымі, хто атрымлівае прыбытак інтэрнэт-грашыма

Расійскія абменнікі інтэрнэт-грошай спыняюць аперацыі з беларускімі рублямі.

Тыя, хто меў грошы ў беларускіх інтэрнэт-рублях (WMB), мог разлічвацца імі ў электронных крамах альбо абменьваць у віртуальных сэрвісах на іншую інтэрнэт-валюту. Цяпер абмяняць грошы стане складана. Па патрабаванні «Тэхнабанка», які кантралюе выкарыстанне WebMoney ў Беларусі, расійскія абменнікі спыняюць працу з WMB.

Па беларускім заканадаўстве, прымаць грошы ў WMB могуць толькі юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі, зарэгістраваныя на тэрыторыі Беларусі, якія заключылі з «Тэхнабанкам» дамовы на разліковакасавае абслугоўванне. Для фізічных асобаў прыманне грашовых пераводаў не прадугледжана. Па законе яны павінны зарэгістраваць ІП і адкрыць разліковы рахунак у адным з беларускіх банкаў. Зразумела, што расійскія сэрвісы не будуць адкрываць ІП у нашай краіне.

У сваім змаганні з «нелегаламі» «Тэхнабанк» пайшоў далей. У апошні час актывізавалася блакаванне карыстальнікаў, якія, сярод іншых, карыстаюцца кашальком з беларускімі вэб-мані. Шматлікія расійскія карыстальнікі нечакана для сябе аказаліся заблакаванымі толькі за тое, што мелі гэты кашалёк з рэшткамі WMB. Але разам з тым «Тэхнабанк» блакаваў і іншыя кашалькі карыстальніка, тым самым паралізуючы любыя яго дзеянні па кіраванні сваімі грашыма. Тым самым парушаўся банкаўскі кодэкс.

У аддзеле электронных грошай «Тэхнабанка» патлумачылі: «Мы дзейнічаем у межах беларускага закона. Кожны, хто заводзіў інтэрнэт-кашалёк WMB, падпісваў дамову, у якой пра гэта гаварылася. Мы рассылалі неадназаразовыя папярэджанні, магчыма, хваліо абурэння ў інтэрнэце падняў менавіта такі папярэджаны, які не адрэагаваў на нашую настойлівую просьбу».

**ЯВ**



Бараку Абаму на саміце «дваццаткі вялікіх дзяржаў» прыйшлося нялёгка. Яго крытыкавалі за жаданне ЗША дэвальваваць даляр дзеля падтрымкі амерыканскага таваравытворцы.

## Лукашэнка: дэвальвацыі не будзе

На сустрэчы з жыхарамі Барысава кіраўнік дзяржавы ўчарговы раз запэўніў у надзейнасці нацыянальнай валюты. І заадно пастрашыў абвалам даляра: «Будзьце асцярожныя з гэтым далярам. Я вас папярэдзіў».

**ЯВ**

## Стыпендыі выраслі, але...

На мінулых выбарах Лукашэнка абяцаў давесці стыпендыі да 30% ад сярэдняга заробку.

Студэнты зноў пабагацелі задняй датай. З 1 лістапада стыпендыі вырастуць яшчэ на 30%. За гэты год стыпендыі павялічвалі ўжо двойчы. Цяпер беларускія студэнты штомесяц будуць атрымліваць ад 148 тысяч да 237 тысяч рублёў. Аднак абяцаных паказчыкаў стыпендыі ўсё адно не дасягнулі.

Напярэдадні мінулых прэзідэнцкіх выбараў Лукашэнка абяцаў давесці стыпендыю да ўзроўню 30% ад сярэдняга заробку ў краіне. Значыцца, на цяперашні момант яна павінна складаць $130. Рэальна ж максімальная стыпендыя не дасягае і $80.

**ЯВ**

## Сцісла

• **Даляр пабіў гістарычны рэкорд.** На аўторак курс амерыканскай валюты быў выстаўлены на ўзроўні 3035 рублёў.

• **Сусветны банк дае Беларусі $150 мільёнаў на мадэрнізацыю аўтадарог.** Асноўная частка сродкаў будзе выдаткаваная на пашырэнне 53-кіламетровага кавалка цяперашняй двухпалоснай аўтадарогі паміж Мінскам і Бабруйскам да чатырох палосаў. Грошы выдаюцца на 15 гадоў з пяцігадовай адтэрміноўкай плацяжоў.

• **Іран інвестуе у Беларусь 250 мільёнаў еўра.** Іранскія кампаніі пабудуюць у Мінску гандлёвы комплекс. Мяркуецца, аб'ём гандлю паміж краінамі дасягне да канца года $90 млн.

• **Беларускі інвестыцыйны форум пройдзе 17 лістапада.** Ён адбудзецца ў рамках Еўрапейскага фінансавага тыдня ў Германіі. Папярэднія форумы праходзілі ў Лондане і Мінску.

• **І Новая Зеландыя!** Налета Беларусь, Расія, Казахстан, Новая Зеландыя створаць зону свабоднага гандлю. Астраўную дзяржаву перадусім цікавяць расійскія прыродныя рэсурсы — нафта, газ і лес.

• **Для крэдыту не спатрэбяцца паручальнікі?** Рыхтуецца ўказ, згодна з якім, гарантам вяртання крэдытаў застануцца заробак і застава маёмасці. З праектам указа ўжо пагадзіліся банкі.

**ЯВ**

# Дык хто дазволіў ацыбуліць царкву ў Навагрудку?

Працяг са старонкі 1.

Начальнік аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама Аляксандр Карачан пераконваў «НН», што ўсё было законна. «Дазвол быў, але айцец Мікалай (настаяцель царквы Св. Барыса і Глеба а. Мікалай Орса — «НН») трохі парушыў форму купалаў, вызначаную на пасяджэнні навукова-метадычнай рады ад 3 лістапада». У чым было парушэнне і якую форму для купалаў прапанавала рада, чыноўнік не патлумачыў.

Як апынулася, дазволу на працы ў царкоўнага прыхода сапраўды не было. «Вы бачылі дакумент з пячаткамі і подпісамі? Я чуў пра гэта, што нібыта ёсць такі дазвол. Але ён яшчэ толькі рыхтуецца», — заявіў начальнік Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Ігар Чарняўскі. Пра цыбулепадобныя купалы Ігар Мяфодзевіч выказаўся абцякальна: «Яны могуць быць, не мусяць, а могуць. Як элемент функцыянальнага прыстасавання аб'екта».

У панядзелак 15 лістапада ў Навагрудак прыязджаў прадстаўнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама. Сумесна з прадстаўнікамі аддзелу культуры Навагрудскага райвыканкама ён падрыхтаваў на адрас прыхода царквы Барыса і Глеба прадпісанне. Паводле яго, настаяцель царквы павінен будзе падпарадкавацца рашэнню навукова-метадычнай рады Міністэрства культуры, якое пакуль рыхтуецца, і ўнесці згодна яго змены ва ўсталяваныя купалы.

Антон Астаповіч каментуе развіццё падзей вакол навагрудскай царквы з асцярожным аптымізмам. Па яго словах, раней па ўсёй Беларусі будынкі цэркваў, ці былых касцёлаў з ініцыятывы святароў і з маўклівай згоды мясцовых уладаў перабудоўваліся без атрымання дазволу ад Міністэрства культуры. Яно ж умешвалася ў справу постфактум, калі часцей за ўсё ўжо было позна штосьці змяняць. Так было ў Клецку, Гошчаве Івацэвіцкага раёну, у Навагрудку. «Складваецца ўражанне, што ад міністэрства мала што залежыць. Яно фактычна нічога не можа зрабіць з парушальнікамі заканадаўства», — кажа А. Астаповіч. Але, па яго назіраннях, сітуацыя змяняецца: «Мінкультуры пачало выяўляць імкненне разабрацца ў сітуацыі. На працягу апошніх месяцаў прасочваецца пэўная сістэма дзеянняў у дачыненні да аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны». Старшыня таварыства прыводзіць прыклад: у часе апошняга візіту ў міністэрства ён даведаўся, што ведамствам рыхтуецца рашэнне па былым дамініканскім касцёле ў Клецку. На ім, без дазволу Мінкульту і з парушэннем заканадаўства былі ўсталяваныя цыбулепадобныя купалы. Паводле Астаповіча, цяпер разглядаецца пытанне вяртання будынку былога клецкага касцёла аўтэнтычнага выгляду. З асцярожным аптымізмам спадар Астаповіч гаворыць і пра навагрудскую гісторыю: «Прыклад Клецка паказвае, што ў навагрудскай царквы не самыя горшыя перспектывы».

Нагадаем, што працы па рэканструкцыі пачаліся ў чэрвені гэтага года і выклікалі скандал (гл. «НН» №25 ад 07.07.10 г.). Антон Астаповіч заявіў тады пра незаконнасць працаў. Настаяцель царквы запярэчыў, што дазвол атрымаў. За царкву ўступіліся інтэлектуалы. У выніку, на сітуацыю вакол помніка архітэктуры адрэагавала Міністэрства культуры. Упраўленне па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі міністэрства падрыхтавала прадпісанне па вядзенні рэстаўрацыйных працаў у Навагрудку і даслала яго копію ў Навагрудскі райвыканкам.

**Сямён Печанка**



ЗМІЦЕР РАГАЧОЎ

**Святар пасадзіў цыбуліны на гатычную царкву.**

**Царква Св. Барыса і Глеба**

помнік архітэктуры сусветнага значэння. Збудаваная ў 1517—1519 на месцы старажытнага храма XII ст. Фундатар — гетман ВКЛ князь Канстанцін Астрожскі. Помнік архітэктуры ўяўляе сабой сімбіёз гатычнага і рэнесанснага стыляў з рысамі абарончага дойлідства. У 1873—1875 храм перабудавалі ў псеўдарускім стылі, пасля яму вярнулі ранейшы выгляд. Пасля Другой сусветнай вайны царква не функцыянавала, службы аднавіліся ў 1990-я.

# Шапіра ініцыяваў беларусізацыю

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама пачаў весці нарады па-беларуску.



PHOTO.BYMEDIA.NET

З ініцыятывы кіраўніка Гродзенскай вобласці Сямёна Шапіры справаводства ў аблвыканкаме будзе весціся на двух дзяржаўных мовах. Акрамя таго, супрацоўнікам установы раяць размаўляць па-беларуску з наведнікамі і між сабой.

Па словах прэс-сакратара Гродзенскага аблвыканкама Віктара Жалезняковіча, гаворка ідзе пра вусную прапанову Шапіры. Сам старшыня нарады цяпер вядзе па-беларуску. Наступным крокам мусіць стаць абавязковае валоданне беларускай моваю кіраўнікамі раённага ўзроўню.

Старшыню Таварыства беларускай мовы Алега Трусава ініцыятыва кіраўніка Гродзеншчыны не здзівіла. «Калі я ад імя ТБМ павіншаваў Сямёна Шапіру з абраннем на пасаду старшыні аблвыканкама, ён даслаў мне вялікую тэлеграму на добрай беларускай мове, у якой падзякаваў за віншаванне і паабяцаў мацаваць мову ў рэгіёне». Па словах А. Трусава, новы кіраўнік вобласці выгадна розніцца ад свайго папярэдніка. «Вельмі культурны чалавек, не тое што магілёўскія хлопцы, мае землякі».

Хто яшчэ з кіраўнікоў абласцей выказвае прыхільнасць да беларушчыны? «На першае месца я пастаўлю кіраўніка Магілёўшчыны Пятра Рудніка. Ён падтрымлівае мясцовае ТБМ, выступіў з прапановай правядзення года Роднай мовы. Шмат чаго добрага зрабіў», — кажа А. Трусаў. Другое месца ў сімвалічным рэйтынгу атрымлівае Сямён Шапіра, а на трэцім апынаецца старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец. «На лісты адказвае па-беларуску, у размове мовы не цураецца».

Увогуле, мяркуе старшыня ТБМ, сярод сённяшніх кіраўнікоў абласцей і раёнаў няма ворагаў беларушчыны. «Прыходзіць новае пакаленне, я іх называю дзецьмі Адраджэння. Гэтыя людзі выраслі ў часы незалежнасці. Таму ў цэлым сітуацыя сёння лепшая, чым гады 2-3 таму».

**СП**

**Сямён Шапіра**

нарадзіўся ў 1961 у в.Рэчань Любанскага раёна Мінскай вобласці. Доктар эканамічных навук, прафесар. У 2008—2010 — міністр сельскай гаспадаркі. 20 мая 2010 змяніў на пасадзе старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанку.

# Кошт спартсекцый вырас на 55%

Заробкі бюджэтнікам выраслі. Плацяжы таксама.

У Рэдакцыю звярнуліся бацькі са скаргай на падвышэнне цэнаў у дзіцячых спартшколах. Месяц заняткаў дзюдо для школьніка вырас ажно на 55% (з 27 да 42 тысяч). У чым прычына? Аказалася, у росце нашага багацця.

З 1 лістапада ў Беларусі павысіліся працоўныя пенсіі, тарыфная стаўка першага разраду, мінімальная зарплата, бюджэт пражытачнага мінімуму, а таксама ўведзены новыя карэктуючыя каэфіцыенты да тарыфных ставак бюджэтнікаў.

Адпаведна, выраслі і тарыфы на навучанне дзяцей у платных спартовых секцыях і гуртках.

**Кастусь Матушыч**

**Што пачым сярод секцый:**

**Спартыўная гімнастыка** — 84 000 на месяц (СДЮШАР па спартыўнай гімнастыцы).

**Мастацкая гімнастыка** — 64 000 на месяц (СШ №132, вул. Глебкі, 86).

**Акрабатыка і батут** — 100 000 на месяц (вул. Каліноўскага, 111).

**Шахматы** — 33 000 на месяц (СДЮШАР №11).

**Плаванне** — 49 600 на месяц (СДЮШ «Арляня»).

**Веславанне на байдарках** — бясплатна (ДЮСШ, вул. Нававіленская, 25).

**Футбол** — бясплатна (ДЮСШ «Матор»).

**Дзюдо** — 42 000 на месяц (СДЮШАР №7).



**Колькі каштуе адправіць дзіця ў спартовую секцыю?**

Адным з дарагіх відаў спорту ў сталіцы аказалася **фігурнае катанне** (ДЮСШ, вул.Прытыцкага, 27). За лістапад заняткі каштуюць 201 тысячу рублёў. Але штомесяц сума будзе павялічвацца на паўтары тысячы. Пры гэтым патрабуюцца свае канькі і форма, што абыдзецца бацькам нятанна.

А самы запатрабаваны від спорту — **тэніс**. Набору ў спартшколу (СДЮШАР № 1 БФСТ «Дынама»), куды звярнуўся карэспандэнт, няма. Усе месцы занятыя.

Займацца **хакеем** прапануецца бясплатна (ДЮСШ па хакеі з шайбай «БФСТ «Дынама»).

Нечаканасцю аказаліся і бясплатныя заняткі па **веласпорце** (ДЮСШ, пр. Пераможцаў,2) і **фехтаванні** (СДЮШАР, вул. Каліноўскага, 55).

Бясплатна можна наведваць і заняткі па **кулявой стральбе** (СДЮШАР №13). Краіна не застанецца без снайпераў.

# Супрацоўнік «Альфы» забіў амонаўца

падчас прыёму на працу.

У шпіталі, не прыходзячы ў прытомнасць, памёр супрацоўнік палка міліцыі спецыяльнага прызначэння ГУУС Мінгарвыканкама. Несумяшчальную з жыццём траўму 25-гадовы міліцыянер атрымаў падчас тэставых выпрабаванняў для прыёму на службу ў групу «А» («Альфа») КДБ.

Старшына міліцыі праслужыў чатыры гады міліцыянтам-кіроўцам. Пасля пільнага медабследавання ён прайшоў псіхалагічнае тэставанне, праверку на дэтэктары хлусні і быў допушчаны да заліку па фізпадрыхтоўцы.

Трагедыя здарылася 6 кастрычніка падчас спарынгу па рукапашным баі, які праводзіцца паводле наступнай схемы: два паядынкі па тры хвіліны, поўны кантакт, дазволеныя ўсе прыёмы.

Кандыдату на службу ў «Альфе» супрацьстаяў дасведчаны інструктар. Старшына прапусціў удар у галаву і ў стане комы быў дастаўлены ў бальніцу, дзе ў яго дыягнаставалі чэрапна-мазгавую траўму.

Медыкі рабілі ўсё магчымае, але выратаваць міліцыянера не змаглі. Ён памёр 10 лістапада. У дзень савецкай міліцыі...

**Яго блізкім не даводзіцца разлічваць на страхоўку.**

У праваахоўных органах тое, што адбылося, не каментуюць, спасылаючыся на праверку.

Супрацоўнікі органаў унутраных спраў падлягаюць абавязковаму дзяржаўнаму страхаванню. У выпадку гібелі супрацоўніка міліцыі яго сям'і выплачваецца страхавая сума памерам 10-гадовай сумы акладу грашовага ўтрымання і надбаўкі за выслугу гадоў загінулага. Аднак тычыцца гэта толькі тых сітуацый, калі міліцыянер выконваў свае службовыя абавязкі.

Траўму, якая прывяла да смерці, старшына палка міліцыі спецыяльнага прызначэння атрымаў у вольны ад службы час. А гэта значыць, што яго блізкім не даводзіцца разлічваць на страхоўку.

Сёлета гэта ўжо не першы выпадак, калі беларускія спецпадраздзяленні губляюць сваіх байцоў. Некалькі месяцаў таму падчас трэніровачнага ныраня з аквалангам загінуў супрацоўнік антытэрарыстычнага падраздзялення МУС «Алмаз».

**Максім Трапезнікаў, «Беларускія навіны»**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Клуб «Рэактар» — адзін з папулярных у Мінску. На фота: Хэлоўін у «Рэактары».

# Смерць у клубе

«Чалавек нападпітку можа загінуць дзе заўгодна».

У ноч з 6 на 7 лістапада ў мінскім клубе «Рэактар» здарылася трагедыя: 36-гадовы мужчына ўпаў з галерэі на танцпляцоўку. Да шпіталя яго не давезлі — сканаў.

Экспертыза, якую праводзіць пракуратура Савецкага раёна, яшчэ не скончаная. Цяжка сказаць дакладна, ці быў мужчына нападпітку або пад уздзеяннем наркотыкаў. Сведкі кажуць, што без спіртнога не абышлося.

Падчас здарэння, кажуць відавочцы, на сцэне адбываўся конкурс на «штонебудзь смешнае».

Ад падзення з галерэі другога паверха, дзе стаяць столікі, на танцпляцоўку наведнікаў засцерагаюць толькі парэнчы. Гэта звычайная практыка ў клубах. Калі праз іх перагнуцца, можна ўпасці — як і з любога балкона.

І ў чым корань праблемы — у нізкіх парэнчах ці ў саміх наведніках? Бары ў клубах працуюць, хоць яны і дарагія, але попытам карыстаюцца. А хто бяднейшы, праносяць гарэлку з сабой у вопратцы. Або выпіваюць перад уваходам.

Андрэй Старцаў, дырэктар «Рэактара», кажа, што прэтэнзій да клуба ніхто не мае: «Мы нацягнулі канат. Зараз, каб зваліцца з другога паверха, трэ будзе пастарацца. За 15 гадоў ніводнага здарэння не было ў клубе. Чалавек нападпітку можа загінуць дзе заўгодна і як заўгодна».

Зрэшты, пакуль не даказана, што нябожчык быў п'яны.

**Юрась Ускоў**

## Сціслa

**•Жыхарка Барысава прадала ў сэксуальнае рабства 20-гадовую сястру.** Ад красавіка да лістапада 20-гадовая беларуска была ў сэксуальным рабстве ў Грэцыі. Яе ашукала стрыечная сястра, 32-гадовая жыхарка Барысава. Гэта яна з Грэцыі запрасіла сястру да сябе, паабяцаўшы высокааплатную працу, не звязаную з інтымам. Прыехаўшы ў Грэцыю, дзяўчына трапіла ў бардэль. У дачыненні да сваячкі распачалі справу па ч.2 арт.181 Крымінальнага кодэкса (гандаль людзьмі). Ёй пагражае 12 гадоў пазбаўлення волі.

**•Труп знайшлі ў кантэйнеры для смецця.** 48-гадовы мінчук прыйшоў у госці да знаёмых, выпівалі. Праз нейкі час усчалася сварка, і гаспадар кватэры дзесяць разоў ударыў госця нажом, ад чаго той памёр. Двое сутак труп праляжаў у кватэры, а пасля гаспадар з сужыхаркай загарнулі яго ў поліэтылен і коўдру ды вынеслі ў кантэйнер. Іх затрымалі.

**•П'яны беларус палез па мабільнік у маскоўскім метро.** Цягнік у Маскоўскім метрапалітэне збіў жыхара Беларусі. Здарэнне адбылося на станцыі «Беларуская кальцавая». 20-гадовы жыхар Пінска быў выпіўшы. Ён упусціў на рэйкі свой мабільнік, дый скочыў па яго, а акурат прыбываў цягнік. Цяпер ён у шпіталі ў вельмі цяжкім стане.

**•Спрабавалі праскочыць мяжу пад прыкрыццем фураў.** Трое грамадзян Грузіі спрабавалі незаконна перайсці беларуска-літоўскую мяжу. Яны хаваліся за грузавікамі, мяркуючы, што памежнікі іх не заўважаць. Парушальнікаў чакае дэпартацыя з Беларусі.

**•Чатыры месяцы арышту за браканьерства.** Суд Рэчыцкага раёна даў жыхару вёскі Аляксандраўка чатыры месяцы арышту з выплатай 1,6 млн рублёў за незаконную лоўлю рыбы. Яго суўдзельнік-аднавясковец атрымаў штраф 1,8 млн і абавязаны пакрыць шкоду ў памеры 1,7 млн рублёў. Іх злавілі на Дняпры ў чоўне з забароненымі сеткамі і здабычай — лінямі, акунямі, шчупакамі.

**•8-гадовы хлопчык загінуў з-за сабакі.** Хлопчык гуляў са сваімі стрыечнымі братамі ля трубаў цеплатрасы. Побач было дрэва, на якім дзеці збудавалі «тарзанку» і гойдаліся, адштурхоўваючыся ад труб. Хлопчык вырашыў пажартаваць, звязаў з вяроўкі пятлю, крыкнуў братам, што павесіцца, і надзеў пятлю на шыю. Раптам пад ногі дзіцяці скочыў беспрытульны сабака, што бегаў паблізу. Хлопчык паслізнуўся і зваліўся з трубы. З пятлі яго дастала жанчына, якая ўбачыла здарэнне з акна аўтобуса, але адратаваць дзіця ўжо не ўдалося.

**•Вакол цела на полі — правільна накрэслены круг.** Цела 72-гадовага пенсіянера знайшоў вайсковец ля вёскі Камень Валожынскага раёна. Памерлы ляжаў на жываце. На нагах не было шкарпэтак, калошы штаноў закасаныя амаль да калена. Вакол цела на полі — правільна накрэслены круг. Судмедэксперты звязваюць гэта з тым, што калі чалавек пачынае замярзаць, ён перад смерцю адчувае гарачыню і можа выконваць неадэкватныя дзеянні. Напрыклад, распранацца.

**СМ**

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

## Насці Навумавай трэба наша дапамога



Насця Навумава — доўгажыхар дзіцячага анкацэнтра. У 2007 г. яна ўдарыла нагу, і на тым месцы ўтварылася пухліна. Дыягназ — альвеалярная рабдаміясаркома правай галёнкі, II стадыя. Дзяўчынка мужна перанесла 9 курсаў хіміятэрапіі, дзве аперацыі і курс прамянёвай тэрапіі. Праз два гады жыцця ў анкацэнтры наступіла паляпшэнне. Насця паспела адгадаваць свае чароўныя кудзеркі. Але ў 2010 хвароба дала рэцыдыў з паразай мяккіх тканак правага сцягна, левага вузла пахвіннай вобласці і правага лёгкага. Косны мозг дзяўчынкі знясілены — хіміятэрапію праводзіць больш нельга. Зараз яна праходзіць апрамяньванне на вобласць лёгкага і рыхтуецца да чарговай аперацыі. Але вось няўдача — вакол новай пухліны дробныя сасуды, і яе вельмі рызыкоўна выдаляць. Мама Насці вядзе перамовы з нямецкай клінікай Charite ў Берліне. Яны гатовыя ўзяць дзяўчынку на лячэнне. Гэта будзе каштаваць 150—200 тысяч еўра. У бліжэйшы час немцы вызначацца з курсам лячэння — ад гэтага будзе залежаць дакладная сума.

Кантакты: маці — Навумава Алена Яўгенаўна (29) 618–47–56.
Рэквізіты: ААТ ААБ «Беларусбанк», філіял № 323, г. Рэчыца, вул. Леніна, 51А
УНП 400230587
МФА 15150682
Беларускія рублі:
транзітны рахунак № 3819382102841 для залічэння на дабрачынны рахунак № 000000032
Даляры ЗША:
транзітны рахунак № 3819382107035 для залічэння на дабрачынны рахунак № 8400000000066
Еўра:
для залічэння на дабрачынны рахунак № 9780000000021
Расійскія рублі:
для залічэння на дабрачынны рахунак № 6430000000016
Разліковы рахунак № 6111000000093 код 795 у ААТ «АСБ Беларусбанк» для Навумавай Алены Яўгенаўны.
Таксама можна перавесці грошы на кашалёк EasyPay 08492425 з пазнакай «для Насці Навумавай».

# Халіп: Акалічнасці справаў добра вядомыя

**Пісьменнік і сцэнарыст Уладзімір Халіп напісаў кнігу «Мы памятаем», прысвечаную зніклым.**



У цэнтры яе — лёсы Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Дзмітрыя Завадскага і Генадзя Карпенкі. Аўтар адказаў на пытанні «НН».

**«Наша Ніва»: Чаму ўзяліся за напісанне гэтай кнігі?**

**Уладзімір Халіп:** Ёсць такі «Свабодны тэатр». Дык вось, ён займаецца не толькі пастаноўкамі, але і выдае неблагія кнігі. Яны мне і прапанавалі напісаць кнігу з успамінамі родных і блізкіх зніклых. Шмат часу прайшло, і людзі пацІху пачынаюць забывацца на іх.

**«НН»: Нешта новае ўдалося напісаць?**

**УХ:** Я не ставіў сабе за мэту знайсці нейкую сенсацыю. Усе акалічнасці справаў добра вядомыя. Ёсць хаця б даклад дэпутата Хрыстаса Пургурыдэса, які паказвае, хто ёсць хто. Не хапае толькі юрыдычнай працэдуры. Давесці юрыдычны бок да ладу маглі б як нашы, так і замежныя суддзі. У Іспаніі некалі быў цудоўны прэцэдэнт, калі звычайны суддзя завёў крымінальную справу на Пінахэта.

**«НН»: Працаваць над кнігай было цяжка?**

**УХ:** Так. Асабліва, калі бачыў, якое спусташэнне было прынесенае ў гэтыя сем'і. Мне рэкамендавалі, каб кніга была ў форме гутарак. Але гэта амаль немагчыма. Пытацца ў людзей, як яны правялі першую ноч пасля знікнення? Таму кніга ў форме маналогаў. Хаця яны гучаць хутчэй як споведзі. Таксама, апроч родных зніклых, гучаць галасы людзей, што былі добра знаёмыя з імі: Анатоля Лябедзькі, Андрэя Саннікава, Сяргея Законнікава.

У Іспаніі некалі быў цудоўны прэцэдэнт, калі звычайны суддзя завёў крымінальную справу на Пінахэта.

**«НН»: А якія ўспаміны найбольш заселі ў душы?**

**УХ:** Напрыклад, размова з маці генерала Захаранкі. Яна ўсё яшчэ верыць, што яе сын вернецца, што зараз ён можа знаходзіцца ў нейкай патаемнай турме. Яна казала, што ў Васілевічах ёй усе зайздросцілі, што ў яе такія добрыя і працавітыя сыны. Адзін загінуў пры выпраменьванні на падлодцы, а другі — трагічна знік. І гэты ўвесь боль маці, якая перажыла сваіх сыноў. Яна мяне вадзіла па садзе, што пасадзіў Юры. Адна бяроза ўжо вышэйшая за хату. Якой вышыні павінна дасягнуць дрэва, каб у справах была пастаўленая кропка? Я размаўляў у Нямеччыне з жонкай Захаранкі Вольгай і яго дачкой Аленай. Гэтыя людзі мараць вярнуцца ў Беларусь. Іхняе жыццё там не склалася. Але, гледзячы на ўнука Кірылу, яны разумеюць, што не зробяць гэтага.

**«НН»: На каго разлічана Ваша кніга?**

**УХ:** На простых людзей, якія, магчыма, недастаткова шмат ведаюць пра справы, але хацелі б даведацца больш. Прэзентацыя ўжо адбылася ў Амерыцы. Там кніга выклікала вялікую цікавасць.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

# «Добра жылося цыганам за баронам Марцінкевічам…»

**Прымусовая дэпартацыя цыган у Францыі нагадала пра існаванне гэтага народа. Як успрымаюць гэта беларускія «рамалы»? І якія ў іх сёння праблемы? Мы запыталіся ў старшыні Асацыяцыі беларускіх цыган «Рома» Аляксандра Басяцкага.**

**—Чаму беларускія цыганы маўчаць? Чаму ў прэсе, у адрозненне ад іншых краін, не з'явілася пратэстаў супраць дзеянняў французскіх уладаў? Чаму не закідваеце яйкамі французскую амбасаду?**

—Мы ўспрымаем падзеі ў Францыі з вялікім болем. Гэта аўтаматычна адбіваецца і на беларускіх цыганах. Вялікі дзякуй Еўрапарламенту, які выступіў у падтрымку румынскіх цыган.

Цыганы — частка еўрапейскай сям'і. Такія ж грамадзяне, як і іншыя.

**—Колькі цыганоў у Беларусі?**

—50—60 тысяч. Па афіцыйных дадзеных, іх дзесьці каля 25 тысяч. Сітуацыя з лічбамі простая. Напрыклад, я па пашпарце не цыган, а беларус. Гэта яшчэ з савецкіх часоў пайшло, каб цыгану было прасцей уладкавацца на працу.

**—Па статыстыцы, 90% цыганоў не працуюць. З чым гэта звязана?**

Перш за ўсё, негатыўнае стаўленне працадаўцаў. Калі цыганы пачнуць атрымліваць адукацыю, то і стаўленне зменіцца. Не працуюць многія і праз тое, што самі не хочуць.

Што датычыць беспрацоўных, то яны едуць на заробкі ў Расію, займаюцца продажам. Прывозяць сюды, прадаюць на рынках. У Брэсцкай вобласці, ведаю, цыганы ідуць працаваць у калгасы. Некаторыя займаюцца металам, на чым нядрэнна зарабляюць.

**—Чаму сёння, калі праваахоўнікі затрымліваюць за наркотыкі, часта фігуруюць цыганы?**

—Праз сваю дурасць многія трапляюць у падобныя сітуацыі. Вядома ж, яны не вырошчваюць гэтую гадасць на сваіх гародах. За імі стаяць іншыя людзі. А цыганы ў большасці беспрацоўныя, і лёгкія грошы зачароўваюць.

Калі сустракаеш людзей, і яны бачаць, што ты нармальны чалавек, які добра жыве, адразу ж думаюць, што займаешся наркотыкамі. Але не ўсе такія. Проста вобраз такі склаўся.

**—І як цыганам пазбавіцца ад вобразу, які ім навязваюць стэрэатыпы і СМІ?**

—Не ведаю. За камуністамі жылі, ніхто не займаўся ніякімі наркотыкамі. Захацелася прыгожа жыць. Думалі, што гэты бардак у краіне будзе заўсёды. Жулікаў хапае не толькі сярод цыганоў. Але калі трапіцца цыган, то менавіта яго пакажуць па тэлебачанні...

**—Як з адукацыяй?**

—Тое, што многія цыганы не ідуць вучыцца, — праблема. Мы толькі 50 гадоў таму выйшлі з лесу, і адразу трапіць «у струмень» немагчыма. Таму большасць цыган не навучаецца. Самі не хочуць. У школе вучацца ўсе, а у ВНУ ідуць нямногія.

**—Чаму цыганы не ўдзельнічаюць у палітычным жыцці краіны? Чаму няма дэпутатаў, моцных лідараў?**

—Я калісьці выстаўляў сваю кандыдатуру, спрабаваў балатавацца ў мясцовыя саветы ад ЛДП. Мы б хацелі, каб былі дэпутаты, палітыкі, але не прапускаюць. Трэба мець свайго дэпутата, які адстойваў бы нашыя інтарэсы, каб праз яго можна было вырашаць усе пытанні.

**—Колькі сёння цыганскіх арганізацый у Беларусі?**

—Чатыры: дзве ў Мінску, па адной — у Гомелі і Ашмянах. У сталіцы дзейнічаюць Асацыяцыя беларускіх цыганоў «Рома» і Беларуская цыганская дыяспара. Але нашы арганізацыі мёртвыя. У нас няма фінансавання, памяшкання, дзе мы маглі б збірацца. У нас нават няма сваёй дзяржавы, якая б нас падтрымлівала. Таму даводзіцца збірацца па хатах і вырашаць свае пытанні.

Вось чаму нас так цяжка цяпер знайсці. Наш барон і старшыня асацыяцыі Уладзімір Матвееў памёр. І мы робім перарэгістрацыю арганізацыі. У нас з'явіцца свой юрыдычны адрас. Тады знайсці нас будзе прасцей.

**—Раней мястэчка Мір было сталіцай цыганоў. Там была рэзідэнцыя барона. Як з гэтым цяпер?**

—Асабліва добра жылося мясцовым цыганам за баронам Янам Марцінкевічам, які развіваў культуру. Але, на жаль, сёння даказаць сваё правы немагчыма, бо пісьмовай мовы ў нас няма, а значыць, і дакументаў таксама няма...




**Лідары цыганскай грамады цалуюць руку мітрапаліту Філарэту.**

Калі б нам далі хаця б невялікую частку замка, мы б зрабілі музей цыганскай культуры. Мы б маглі ладзіць фестывалі нацыянальнай культуры. Ва Украіне і Расіі кожны год праводзяцца цыганскія фестывалі. Мы б маглі таксама ў Міры 8 красавіка, у Дзень цыганоў, праводзіць святочныя праграмы. У нас ёсць магчымасці зрабіць там добры фестываль, якога, на жаль, пакуль няма ў Беларусі.

**—Цыганскі народ падобны да яўрэяў, якія таксама доўгі час не мелі сваёй дзяржавы. Але абодвум народам удалося захаваць сваю культуру. Як сёння ў Беларусі падтрымліваецца цыганская культура?**

— У Мінску ёсць цыганскі ансамбль, але, на жаль, у яго няма падтрымкі. Леанід Марцінкевіч, яго кіраўнік, прыходзіць да мяне, каб я дапамог з касцюмамі. Вось так і падтрымліваецца, на ўласныя сродкі.

Раней цыганы як жылі: засталіся на начлег дзе-небудзь у лесе, распалілі вогнішча і танчаць. Яны жылі гэтым. Быў выпадак, пра які мне расказала старая габрэйка, якая была ў Асвенціме. Калі цыганоў загналі ў барак, яны цэлую ноч танчылі. Раніцой лагер прачнуўся ў цішыні... Цыганы ведалі, што яны памруць, але паміралі годна.

Для цыганоў вялікую ролю грае сям'я, у якой з пакалення ў пакаленне таксама перадаюцца нацыянальныя традыцыі, што робіць нас адметнымі. Плюс да ўсяго — гэта вера ў Бога.

Сёння самая галоўная традыцыя закладзеная ў нашай мове. Яна дапамагае нам захоўваць сваю ўнікальнасць.

**—Калі цыганская мова — галоўнае, на чым трымаецца культура, то як быць нам, беларусам, якія на сваёй мове амаль не размаўляюць?**

—Вы не страціце культуру толькі таму, што ў беларусаў ёсць СМІ, ёсць краіна. А мы страцім толькі таму, што не маем сапраўднай Радзімы і пісьмовай мовы. А каб не забыць беларускую мову, на ёй трэба гаварыць заўсёды і ўсюды! Мяне часта пытаюцца, як нам удаецца захоўваць мову. А як жа інакш, калі я размаўляю са сваёй сям'ёй, са сваімі дзецьмі на цыганскай мове. У мяне цяпер хлопчыку адзін год, з ім я размаўляю выключна па-цыганску, і ён аўтаматычна будзе размаўляць на мове свайго народа.

**Уладзіслаў Кузьмін**

**Аляксандр Басяцкі**

нар. у 1960. Часовы старшыня Беларускай асацыяцыі цыган «Рома». Нарадзіўся ў Бабруйску. Бацька траіх дзяцей. Бізнэсовец. Любіць беларускую прыроду, народ і дранікі. Дэвіз па жыцці: быць заўсёды маладым!

**А што вы думаеце пра цыганоў? Якім чынам можна рашыць праблему гандлю наркотыкамі ў цыганскіх кварталах? Пішыце нам.**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Грыбаўскайце хоча, каб перамог Лукашэнка

Для апазіцыі словы Грыбаўскайце былі нечаканымі.

Прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайце заявіла, што перамога Аляксандра Лукашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах дапамагла б забяспечыць стабільнасць і абмежавала б уплыў Расіі ў постсавецкіх краінах.

Паведаміла пра гэта агенцтва Reuters, спасылаючыся на дыпламатычныя крыніцы. Паводле інфармацыі агенцтва, заява была зроблена на сустрэчы з дыпламатамі, ніякіх афіцыйных пацверджанняў ці абвяржэнняў прэзідэнтка Літвы з гэтай нагоды не рабіла.

«Выказванне Грыбаўскайце адлюстроўвае меркаванні ў некаторых сталіцах Еўрасаюза, што працяг рэжыму Лукашэнкі, нягледзячы на кепскую рэпутацыю ў плане дэмакратыі і правоў чалавека, усё ж лепшы, чым пашырэнне ўплыву Расіі», — піша Reuters.

«Апазіцыя несур'ёзная і не мае шанцаў, — цытуе ананімны еўрапейскі дыпламат словы Грыбаўскайце. — Лукашэнка з'яўляецца гарантам эканамічнай і палітычнай стабільнасці і яе незалежнасці. Мы (Літва) не хацелі б ля сваіх межаў яшчэ адзін кавалак Расіі».

«Магу сказаць толькі тое, што прэзідэнт Грыбаўскайце ніякай афіцыйнай падтрымкі не дэманстравала, а заклікала правесці выбары максімальна адкрыта і дэмакратычна. Лукашэнка гэта публічна паабяцаў», — сказаў прэс-сакратар Грыбаўскайце Лінас Бальсіс.

Прэзідэнтка Літвы прыязджала ў Мінск у другой палове кастрычніка. Візіт напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў не мог разглядацца інакш, як падтрымка дзейснага кіраўніка Беларусі.

Зрэшты, і сама Грыбаўскайце, і я акружэнне ўсяляк гэтае меркаванне аспрэчвалі. Правяла тады лідар суседняй дзяржавы і сустрэчу з апазіцыйнымі кандыдатамі ў прэзідэнты.

Яшчэ пасля таго спаткання Уладзімір Някляеў заявіў, што апазіцыі не трэба разлічваць на падтрымку Захаду.

Публічна тады Грыбаўскайце прапаноўвала апазіцыі аб'яднацца.

«Тут у адным выступе яна быццам бы падтрымлівае Лукашэнку і адначасна нападае на Расію. Гэта зусім не тое, што я чуў ад прэзідэнта Грыбаўскайце і ў Вільні, і тут у Мінску падчас сустрэчы з ёй», — для Андрэя Саннікава такія заявы сталі нечаканасцю.

Словы Грыбаўскайце ў нейкай ступені могуць адлюстроўваць і пазіцыю Еўрасаюза. Магчыма, яны і не вельмі задаволеныя недэмакратычнасцю Лукашэнкі, але гатовы цярпець яго ў выпадку змяншэння ўплыву Расіі.

Малаверагодным ёсць тое, што гэтыя выбары будуць прызнаныя справядлівымі, але пэўны прагрэс будзе зафіксаваны, што дазволіць Еўропе ўцягваць афіцыйны Мінск у супрацоўніцтва.

**Зміцер Панкавец**

# Віціс Юрконіс: У Літве асцерагаюцца, што апазіцыя пад уплывам Масквы

Эксперт літоўскага Цэнтра ўсходнееўрапейскіх даследаванняў Віціс Юрконіс адказвае на пытанні «НН».

**«Наша Ніва»: Ці сапраўды Літва зацікаўленая ў захаванні ўлады Лукашэнкі ў Беларусі?**

**Віціс Юрконіс:** Гледзячы на тое, што мець на ўвазе пад Літвой. Адзінага меркавання няма і быць не можа. Вось я 3 лістапада ўдзельнічаў у канферэнцыі на гэтую тэму. Дэпутат Зінгерыс выступіў за ўсталяванне дэмакратыі, празрыстыя выбары. Частка эліты асцерагаецца, што апазіцыйныя кандыдаты пад уплывам Масквы, таму прапаноўваюць захаваць статус-кво. Прэзідэнт Грыбаўскайце ж, мне здаецца, сыходзіць з таго меркавання, што правілы гульні павінны быць аднолькавымі для ўсіх кандыдатаў. Хай гэта будзе Лукашэнка, Някляеў, Рымашэўскі, Саннікаў ці Мілінкевіч. І хто выйграе ў такіх умовах, той і выйграе.

**«НН»: Заява Грыбаўскайце ці адлюстроўвае неяк і пазіцыю Еўрасаюза?**

**ВЮ:** Тут тое самае. Адзінай пазіцыі няма. Той жа нямецкі міністр Вестэрвеле падчас свайго візіту ў Мінск гаварыў пра важнасць правоў чалавека. Але ж не толькі ў Літве гавораць пра небяспеку расійскага ўплыву. У Еўрасаюзе такіх людзей таксама хапае. Грыбаўскайце толькі ў нейкай ступені агучвае гэты кантэкст.

**«НН»: Ці можна ў сувязі з гэтым гаварыць пра спыненне падтрымкі краінамі ЕС беларускай апазіцыі?**

**ВЮ:** Яна змяншаецца ўжо даўно. Гэта не тэндэнцыя вашых цяперашніх выбараў. Шмат хто на Захадзе лічыць праект беларускай апазіцыі непаспяховым. Але ўсе гэтыя крытыкі ў адным жорстка памыляюцца, бо нельга гаварыць пра беларускую апазіцыю ў класічным еўрапейскім разуменні. Яны больш дысідэнты.

Адносіны з ЕС залежаць ад сцэнара перамогі Лукашэнкі.

**«НН»: А як будуць развівацца адносіны ЕС і Беларусі ў выпадку перамогі Лукашэнкі?**

**ВЮ:** Тут залежыць ад сцэнароў перамогі. Ці гэта будзе «элегантны» выйгрыш, ці з пэўнымі саступкамі Расіі і Еўрасаюзу. На першы погляд, дарэчы, здаецца, што ціск Расіі вялікі на беларускае кіраўніцтва, але, на мой погляд, ён не пагражае ўладзе Лукашэнкі. Ціск найперш накіраваны на падпісанне нейкіх пагадненняў. Мне здаецца, што Лукашэнка надалей будзе імкнуцца балансаваць паміж Масквой і Брусэлем. Каб атрымаць нейкую фінансавую дапамогу, трэба пастарацца. Найперш гэта датычыць змены спосабу падліку галасоў і датэрміновага галасавання.

**«НН»: Літоўцы лічаць Лукашэнку надзейным партнёрам?**

**ВЮ:** Асабіста я не думаю, што Літва можа на гэта разлічваць. Наша краіна — маленькі гулец у гэтай партыі. Літва з'яўляецца інструментам у руках Лукашэнкі, накіраваным як на замежную, так і на ўнутраную палітыку. На ўнутраную — як прыклад добрых адносінаў з суседняй краінай. На замежную — як плацдарм для больш шчыльных кантактаў з Еўрасаюзам.

**Гутарыў ЗП**

# Мілінкевіч: Маскве трэба чалавек, які цалкам здасць Беларусь

Лідар Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч падчас інтэрв'ю аднаму з нямецкіх выданняў зноў падняў тэму прарасійскага кандыдата.

«Масква паспрабуе змясціць Аляксандра Лукашэнку з пасады цягам бліжэйшага паўтара года. Галоўная палітычная інтрыга пачнецца ўжо пасля прэзідэнцкіх выбараў», — лічыць А.Мілінкевіч.

На думку Мілінкевіча, Масква падтрымлівае на гэтых выбарах як мінімум аднаго чалавека. Але адмовіўся назваць прозвішча. «Ім патрэбен кандыдат, які цалкам здасць Беларусь Расіі».

На думку палітыка, перад Лукашэнкам цяпер складаны выбар: ці дамаўляцца з Расіяй, каб мець танныя энерганосьбіты, ці пачынаць лібералізацыю, каб атрымаць дапамогу з Захаду.

**ЗП**

# Рымашэўскі абяцае разабрацца з карупцыяй

Кандыдат у прэзідэнты прапануе ўвядзенне «правіла Лінкальна».

Адзін з прыярытэтных накірункаў прэзідэнцкай кампаніі Беларускай хрысціянскай дэмакратыі — барацьба з карупцыяй. Некалі з антыкарупцыйнага дакладу пачынаў і Аляксандр Лукашэнка.

«У нашай краіне існуе татальная карупцыя, асабліва ў малых гарадах. Нашай мэтай ёсць ліквідацыя гэтай заганнай з'явы, — кажа кандыдат у прэзідэнты В.Рымашэўскі. — Пасля нашага прыходу да ўлады колькасць чыноўнікаў будзе зменшаная мінімум у тры разы».

Дарэчы, выступіў Рымашэўскі і з цікавай прапановай: увесці «закон Лінкальна», паводле якога, чалавеку, што выяўляе карупцыю, належыць 25% скрадзенага.

«Пасля нашага прыходу да ўлады ўсім чыноўнікам будзе дадзены трохмесячны тэрмін для пакаяння і прызнання ў карупцыйных злачынствах», — кажа палітык.

БХД цяпер стварае антыкарупцыйны камітэт. Ягоным кіраўніком будзе былы бабруйскі прадпрымальнік Вячаслаў Шэлег. У 2006 годзе ён быў арыштаваны, але праз год усе абвінавачванні былі знятыя. Тым не менш, бізнес сп.Шэлега быў ужо разгромлены. Цяпер ён спрабуе кампенсаваць гэтыя страты, але паўсюль сутыкаецца з адмовамі.

Таксама БХД прыняла заяву да Адміністрацыі прэзідэнта па гульнявым бізнесе. Хадэкі прапаноўваюць на ўзор Расіі і Украіны ўвядзенне «гульнявых зонаў» па-за межамі населеных пунктаў, а таксама забараніць рэкламу азартных гульняў і латарэй.

**ЗП**

**Прафесар Нікітчанка за Рымашэўскага**

Член–карэспандэнт Акадэміі навук, прафесар Іван Нікітчанка падтрымлівае на гэтых выбарах вылучэнца ад хрысціянскіх дэмакратаў. «Рымашэўскі — адзіны кандыдат, які мае ў сваёй праграме чарнобыльскую праблему», — сказаў І.Нікітчанка.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Рыгор Кастусёў і Віталь Рымашэўскі (справа).

## Сцісла

• **Казулін адмаўляецца ад інтэрв'ю.** Былы кандыдат на пасаду прэзідэнта Аляксандр Казулін пакуль не хоча камунікаваць з прэсай. «Да выбараў інтэрв'ю не даю», — зазначыў ён.

• **Уладзімір Асіпенка падтрымае на выбарах Саннікава.** «Мы з Саннікавым яшчэ не гаварылі, але абавязкова пагаворым. Спачатку я хачу сустрэцца з людзьмі, якія абаранялі мяне падчас усёй справы. Я яшчэ не цалкам уліўся ў сітуацыю», — сказаў былы палітвязень.

• **Міхалевіч разлічвае на 20% галасоў.** Такую заяву палітык зрабіў у эфіры радыёстанцыі «Эхо Москвы». Таксама кандыдат зазначыў, што выступае супраць прызнання Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, але бачыць мэтазгоднасць у Мытным саюзе.

**ЗП**

# Лозунг улады на выбарах

Публікацыя праекту праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2011—2015 гг. супала са з'яўленнем на вуліцах Мінска прапагандысцкіх бігбордаў.

У чацвер 11 лістапада ў цэнтральных дзяржаўных СМІ быў апублікаваны праект праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2011—2015 гг. Можна не сумнявацца, што фактычна гэты праект з'яўляецца перадвыбарчай праграмай Аляксандра Лукашэнкі. Ён будзе зацверджаны на Усебеларускім сходзе, які пройдзе 5—6 снежня ў Мінску.

Амаль аднačасова з публікацыяй праекту на вуліцах сталіцы пачалі масава з'яўляцца бігборды прапагандысцкага характару. Калі параўнаць гэтыя выявы з ілюстрацыйным суправаджэннем праекту праграмы ў той жа «Советской Белоруссии», можна лёгка адшукаць шмат падобнага. І там, і там — шчаслівыя ўсмешкі дзяцей і іх бацькоў, спартоўцы і рабочыя, лекары, вайскоўцы і ветэраны.

З бігбордаў можна даведацца пра лозунг, з якім на сёлетнія выбары ідзе Лукашэнка — «Разам мы Беларусь». На выбары 2006 года ён ішоў пад лозунгам «За Беларусь!».



PHOTO.BYMEDIA.NET

### Колькі гэта каштуе

Раней партал Marketing.by паведаміў пра нараду ў Мінгарвыканкаме, на якой было аб'яўлена, каб уладальнікі шчытоў вонкавай рэкламы ў Мінску аддалі для прапагандысцкіх плакатаў каля 50% плошчы. Па самых сціплых падліках гэта можа каштаваць рэкламнаму бізнэсу ад 200 да 400 тысяч даляраў. Усяго было надрукавана (за кошт бюджэтных сродкаў) каля 800 плакатаў 6х3 м 13 відаў.

**Сямён Печанко**

### Праграма Лукашэнкі: Да 2015-га вывесці эканоміку на ўзровень сярэдняй еўрапейскай краіны

Праект праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2011—2015 гады мае быць зацверджаны на Усебеларускім народным сходзе. Ён апублікаваны ў цэнтральных СМІ.

Галоўнай мэтай праграмы названы «рост дабрабыту і паляпшэнне ўмоў жыцця насельніцтва».

Прадугледжана павышэнне рэальных грашовых даходаў насельніцтва да 2015 года ў 1,7—1,76 разу ў дачыненні да 2010-га на аснове забяспечання росту ВУП у 1,62—1,68 разу, аб'ёмаў прамысловай вытворчасці — у 1,54—1,6 разу, сельскай гаспадаркі — у 1,39—1,45 разу, інвестыцый у асноўны капітал за пяцігодку — у 1,9—1,97 разу.

Прыярытэтнымі кірункамі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны названыя развіццё чалавечага патэнцыялу, прадпрымальніцтва, рост экспарту тавараў і паслуг, збалансаванасць і эфектыўнасць замежнага гандлю, якаснае і даступнае жыллё, а таксама ўстойлівае развіццё рэгіёнаў і эфектыўны аграпрамысловы комплекс.

Аўтары дакумента вераць, што да 2015 года ўдасца стабілізаваць колькасць насельніцтва краіны на ўзроўні 9,4 млн. чалавек і павялічыць чаканую працягласць жыцця з 71 года да 72—73 гадоў.

Згодна з праектам праграмы ў 2015 годзе ўзровень забяспечанасці насельніцтва жыллём у разліку на аднаго жыхара складзе не менш чым 27—28 кв. м (у 2010 годзе — 24,1 кв. м).

Праект праграмы таксама прадугледжвае павелічэнне аб'ёму ВУП на душу насельніцтва па парытэце пакупніцкай здольнасці з 14,3 тысячы даляраў ЗША ў 2010 годзе да 26—27 тысяч у 2015-м.

«Эканамічны ўзровень развіцця Беларусі да канца пяцігодкі будзе супастаўным з сярэдняй еўрапейскай краінай», — абяцаецца ў праекце.

# Калі сыдзе Лукашэнка

У маскоўскім выдавецтве выйшла кніга «Аляксандр Лукашэнка. Палітычны партрэт».

Выдавецтва называецца «Партызан», а аўтар кнігі — палітычны аглядальнік радыё «Свабода» Валер Карбалевіч.

На 720 старонках аўтар даследуе феномен — як чалавеку ўдаецца так доўга трымаць уладу.

Гэта трэцяя падобная кніга. Раней партрэт пісалі пяром, а часам і крывёю Святлана Калінкіна і Павел Шарамет — «Выпадковы прэзідэнт», а таксама Аляксандр Фядута — «Аляксандр Лукашэнка. Палітычная біяграфія». Кніга Карбалевіча больш узважаная і менш суб'ектыўная за папярэднія.

У Валера Карбалевіча няма асабістых рахункаў з кіраўніком дзяржавы, таму і да працы ён прыступаў не ў парыве эмоцыяў, а як даследчык.

Прэзентацыя кнігі адбылася 11 лістапада. На яе прыйшлі Някляеў, Лябедзька, Казулін, пасол Швецыі Стэфан Эрыксан, Акудовіч.

У невялікай прамове Карбалевіч паспрабаваў адказаць на пытанні, што задаваліся ў кнізе. Напрыклад, калі сыдзе Аляксандр Лукашэнка.

«Ён не можа сысці. Так называецца апошні раздзел гэтай кнігі, — кажа аўтар. — Ён з'яўляецца не толькі стваральнікам, але і закладнікам сістэмы, якую стварыў. Гэтая сістэма можа існаваць толькі пакуль ён сам ва ўладзе. Калі вырваць гэты элемент, то і сістэма разваліцца».

Аналітык Аляксандр Класкоўскі назваў кнігу «жорсткай, суровай, але абгрунтаванай». На ягоную думку, нельга спадзявацца, што сістэма так хутка знікне, бо за ёй стаяць і звычайныя людзі. Кнігу Класкоўскі параіў уважліва вывучаць, каб «хімеры аўтакратыі не паўсталі зноў».

Карбалевіч падкрэслівае, што не верыць у магчымасць пераемніка ці добраахвотнай здачы ўлады. «Ён будзе кіраваць краінай, пакуль у яго ёсць сілы», — такі прагноз ад Карбалевіча.

Кандыдат у прэзідэнты Уладзімір Някляеў, які прачытаў кнігу яшчэ вясной, на гэта са смехам сказаў. «Ну, дзякуй, Карбалевіч!».

Кніга выйшла ў выдавецтве Паўла Шарамета, у Беларусі пабаяліся яе друкаваць. Не стане яна і на паліцы цэнтральных кнігарняў. Але ў тым, што попыт займее, сумнявацца не даводзіцца.

Дарэчы, кніга на дзве трацiны прафінансаваная самім аўтарам. Філосаф Валянцін Акудовіч выказаў, як падаецца, слушную заўвагу: назва дублюе фядутаўскую.

Нарэшце, прысутныя зычылі аўтару напісаць яшчэ адну кнігу — але ўжо пра наступнага прэзідэнта Беларусі.

**Зміцер Панкавец**



**Валерий Карбалевич. Александр Лукашенко. Политический портрет.** — Москва: «Партизан», 2010

# Някляеў і Саннікаў дамовіліся

супрацоўнічаць, але не здымацца.

Апазіцыйныя кандыдаты на пасаду прэзідэнта Уладзімір Някляеў і Андрэй Саннікаў дамовіліся аб каардынацыі дзеянняў на час выбарчай кампаніі.

Лідар кампаніі «Гавары праўду» згадаў нядаўнюю прэс-канферэнцыю, у якой апроч яго ўдзельнічалі Віталь Рымашэўскі, Мікалай Статкевіч і Анатоль Лябедзька. «Тады мы ні да чога не дамовіліся і ніхто нічога не вынес», — кажа кандыдат.

Андрэй Саннікаў зазначыў, што кандыдаты маюць намер весці супольную агітацыйную і інфармацыйную працу, сумесную міжнародную працу. Гэта дасць свой плён».

А.Саннікаў гаварыў збольшага па-расійску, а У.Някляеў — па-беларуску.

У.Някляеў кажа, што паводле ўсіх вынікаў сацыялагічных апытанняў ёсць два відавочныя лідары — ён сам і Андрэй Саннікаў.




«Мы не разглядаем магчымасці зняцца, — зазначыў А.Саннікаў. — На Плошчы будзем адстойваць выбар народа».

Не абышлося без пытанняў адносна таго, што абодвух кандыдатаў лічаць прарасійскімі.

«Я не баюся такіх абвінавачанняў. Калі з Еўропы гучаць галасы ў падтрымку Лукашэнкі, а з Расіі — у падтрымку апазіцыі, да гэтага трэба прыслухоўвацца і вітаць», — сказаў А.Саннікаў.

«Хто нас падтрымлівае, з тым і будзем размаўляць», — падхапіў У.Някляеў.

Было абвешчана, што напярэдадні выбараў будзе ініцыяваная кампанія супраць датэрміновага галасавання. «Калі вы хочаце жыць у новай Беларусі, то не галасуйце датэрмінова», — сказаў У.Някляеў.

Канкрэтны план сумесных дзеянняў пакуль не абвяшчаўся. Ніякіх пісьмовых пагадненняў кандыдаты не падпісвалі. «Мы джэнтльмены», — адказаў на гэта А.Саннікаў.

**ЗП**

# А мядзведзі там рахманыя

«Масакра» выйшла на экраны кінатэатраў.

Мінская публіка на «Масакру» ходзіць масава, нягледзячы на квіткі па 10 тысяч.

«Карцінка» ўражвае якасцю. Густоўныя колеры, дасканалая апаратарская праца, гук.

Надзіва добра ўпісаліся ў фільм інсталяцыі мастака Артура Клінава, цалкам сплеценыя з саломы. Такога дакладна ў ніводным іншым кіно не пабачыш.

Сюжэт трохі прымаруджаны, як на блакбастар, — тут гэты фільм нагадаў «Дзікае паляванне караля Стаха».

Ёсць і сутнаснае падабенства з апо-весцю Караткевіча: у фільме адчуваецца тая ж ідэя асуджанасці беларускага панства, якое стала чужым і небяспечным для людзей.

Страшна не было. Фільмы-катастрофы нацёрлі цвёрды мазоль на глядацкай душы. Нават мядзведзі выглядалі рахмана. Мы ж бачылі Кінг-Конга і Гадзілу. Крывавыя сцэны знятыя без залішняга натуралізму.

Затое былі фірмовыя кудзіненкаўскія штукі. Рэжысёр падкрэсліваў ментальнае адрозненне беларускага. Знайшоў для гэтага дзіўны спосаб: госць з Пецярбурга не можа ўсачыць позіркам за насельнікамі гэтага дзіўнага краю. Варта адвесці вочы, як суразмоўца — ці то пан-пярэварацень, ці то поп-паўстанец — знікае, каб з'явіцца за спінай ці ў іншым куце пакоя. Нібы яны тут усе і не людзі зусім. Ёсць у фільме і памятная па «Акупацыі» беларуская мова з расійскімі цітрамі (дзе «мазгі праз дупу выскачаць» перакладаецца як «мозги на место встанут»).

Глядач-адпачывальнік, якому індыферэнтны лёс нацыянальнага кіно, у «Масакры» запомніць беларускую мову, дзіўныя саламяныя антуражы і крывавыя сцэны. Не так і мала.

«Масакра» — кіно з моцным паслясмакам. Фільм застаецца ў памяці пасля прагляду, прымушае думаць, дабудоўваць сюжэтныя ланцужкі.

А яшчэ гэта першы фільм, у якім паны гавораць па-беларуску.

**Сяргей Мікулевіч**

Беларусь, 2010, каляровы, 100 хвілін.
**Рэжысёр:** Андрэй Кудзіненка.
**Мастак:** Артур Клінаў.
**Кампазітар:** Алег Хадоска.
**Мантаж:** Аляксандр Дэбалюк.
**Ролі выконваюць:** Дзмітрый Мілер, Андрэй Назімаў, Марыя Курдзяневіч, Аляксандр Колбышаў, Вячаслаў Паўлюць, Сяргей Уласаў, Святлана Зелянкоўская, Аксана Лясная, Сяргей Журавель, Алена Адзінцова, Паліна Сыркіна, Аляксандр Кашпераў, Аляксей Сянчыла, Алег Гарбуз, Іван Мацкевіч, Генадзь Фамін, Аляксандр Малчанаў.
**Жанр:** бульба-хорар паводле сцэнара Аляксандра Качана ды Андрэя Кудзіненкі, складзенага на аснове беларускіх легендаў і «Локіса» Праспера Мерымэ.



Падзеі «Масакры» адбываюцца ў Беларусі ў 1860-х гадах пасля паўстання Каліноўскага. Край здранцвеў пасля тэрору. А госці графа Пазуркевіча, генерал і яго сын, усяляк прыніжаюць тутэйшых.
Сюжэт фільма выбудоўваецца вакол любоўнага трохкутніка: граф Пазуркевіч — Ганна — Мікалай Казанцаў.
Малады мастак Мікалай Казанцаў выдае сябе за прафесара з Пецярбурга. Пазуркевіч, адчуваючы здраду, забівае ўсіх гасцей. Але і сам гіне. А Пазуркевіч ператвараецца ў мядзведзя...

**«Масакра» — першы фільм, у якім паны гавораць па-беларуску.**

# Гран-пры «Лістапада» атрымаў фільм з крытыкай «савецкага чалавека»

— карціна Сяргея Лазніцы «Шчасце маё».

Карціна Сяргея Лазніцы «Шчасце маё» атрымала галоўны прыз 17 Міжнароднага кінафестывалю «Лістапад», што завяршыўся ўчора 12-га. Вырак прафесійнага журы агучыў літоўскі рэжысёр Шарунас Бартас.

Прыз уручаў міністр культуры Павал Латушка, які выглядаў здзіўленым.

Карціна Сяргея Лазніцы, што раней была ў конкурснай Канскай праграме, распавядае пра дальнабойшчыка, які заблукаў дзесьці каля Смаленска — і трапіў у працьму.

Фільм пабудаваны, як страшная дакументальная казка. Кіроўца сустракаецца са сквапнымі міліцыянтамі, разбойнікамі, малалетняй прастытуткай — і губляе ўласную памяць. Васіль Быкаў падказаў Лазніцы эпізод з партызанамі, якія забіваюць настаўніка.

На фестывалі падчас прагляду некаторыя гледачы — пераважна старога веку — заклікалі застрэліць рэжысёра. Але для Лазніцы прынцыповым было стварыць партрэт савецкага чалавека, сэрца якога знішчанае нянавісцю.

На цырымоніі закрыцця акцёр стужкі Віктар Немец падзякаваў за ўзнагароду і нагадаў, што ён з Лазніцам «з аднаго раддома». І рэжысёр, і акцёр — ураджэнцы Баранавічаў. Дарэчы, дакументальная «Днюка» яшчэ аднаго ўраджэнца Баранавічаў Андрэя Куцілы была адзначаная гільдыяй крытыкаў.



**Фільм Сяргея Лазніцы называлі «антырасійскім».**

Спецыяльны прыз журы дастаўся кіргізскаму «Выкрадальніку святла». Гэта фільм пра добрага электрыка, які крадзе для вяскоўцаў святло.

Гран-пры конкурса неігравога кіно журы на чале з Віктарам Аслюком прысудзіла нямецкай «Жанчыне з пяцця сланамі». Гераіня — перакладніца Дастаеўскага з пакручастым лёсам.

Найлепшымі дакументальнымі дэбютамі прызнаныя кітайскі «Апошні цягнік дадому» і эстонскі «Чэмпіён свету» — пра 83-гадовага дзядулю, які скача з шастом.

Сярод ігравых дэбютаў быў вылучаны перуанскі «Кастрычнік» — пра ліхвяра, якому падкінулі дзіця.

Гледачы ўпадабалі «Стракатыя прыцемкі» Людмілы Гурчанкі, індыйскі «Удаан» і венесуэльскага «Брата», якому і дасталіся асноўныя сімпатыі публікі. Дынамічная стужка пра захопленых футболам братоў, уцягнутых у крымінальныя разборкі, таксама атрымала прэзідэнцкі прыз «за гуманізм і духоўнасць».

Але сёлета глядацкае галасаванне адсунутае на другі план. Прыйшоў час прафесійнага «Шчасця майго».

**Андрэй Расінскі**

**ЗБЯРЫ КНІГАРНЮ «НАША НІВА»**




шукайце ў кнігарнях
і ў незалежных распаўсюднікаў

## Сцісла

• **«Кнігазбор» выдаў Ермаловіча.** У серыі «Беларускі кнігазбор» выйшлі выбраныя творы гісторыка Міколы Ермаловіча. У 640-старонкавую ілюстраваную кнігу ўвайшла яго класічная праца «Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае», а таксама крытычныя, публіцыстычныя, літаратурна-мастацкія творы і эпісталярная спадчына. Кніга каштуе 30 тыс. рублёў.

• **Прэзентацыя манеты часоў Грунвальдскай бітвы.** У Гістарычным музеі ў Мінску (Маркса, 12) 2 снежня адбудзецца прэзентацыя ўнікальнай манеты часоў вялікага князя Вітаўта і Грунвальдскай бітвы. Срэбная манета няправільнай формы вартасцю ў пенязь (дэнарый) выробленая метадам ручной чаканкі ў 1380—1400-я ў Навагрудку і знойдзеная ў Навагрудскім раёне. У свеце вядомы дзве такія манеты, другая знойдзеная ў Літве, на тэрыторыі Віленскага замка.

• **На прэзентацыі кнігі Лянкевіча жанілі комін.** 12 лістапада ў Мінску ў Інстытуце Гётэ фатограф Андрэй Лянкевіч прэзентаваў свой фотаальбом «Паганства». На вечарыну прыехаў фальклорна-этнаграфічны гурт з вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна. Пры канцы прэзентацыі жанчыны з Пагоста прадэманстравалі «Жаніцьбу коміна» — абрад з тысячагадовай гісторыяй, першы з унесеных у спіс нематэрыяльных каштоўнасцяў Беларусі. Вечарына прайшла пры аншлагу. Большасць наведнікаў складала моладзь.

• **У Мінску пачалося дзіцячае «Еўрабачанне».** Удзел бяруць 14 канкурсантаў: з Літвы, Малдовы, Нідэрландаў, Сербіі, Украіны, Швецыі, Расіі, Латвіі, Бельгіі, Арменіі, Мальты, Беларусі, Грузіі і Македоніі. Беларус Даніла Казлоў выступіць пад 12-м нумарам. Фінал конкурсу 20 лістапада адкрые дуэт пераможцаў дзіцячага «Еўрабачання» Ксеніі Сітнік і Аляксея Жыгалковіча. Выступіць і Аляксандр Рыбак з уласнай кампазіцыяй. Беларускія выканаўцы бяруць удзел у дзіцячым «Еўрабачанні» з 2003 года. За гэты час Беларусь двойчы станавілася пераможцай конкурсу.

**СМ**

# «Аўсянкі»: публіка і журы «Лістапада» не дараслі




Такі дыягназ паставіла крытык Людміла Рублеўская.

«На фестывалі «Лістапад» паглядзела фільм «Аўсянкі» ўральскага рэжысёра Аляксея Фядорчанкі паводле аповесці Дзяніса Асокіна, — расказвае ў сваім інтэрнэт-дзённіку раманістка і аглядальніца «Советской Белоруссии». — ...Горад у расейскай глыбінцы. Галоўны герой — саракагадовы халасцяк, сын мясцовага самадзейнага паэта, пісьменнік Аіст Сяргееў (як бы сам аўтар)...

Працуе на папяровым камбінаце. У дырэктара камбіната, буйнога прамыслоўца Мірона памірае маладая жонка, і ён просіць Аіста дапамагчы яму завезці жончына цела нібыта ў суседні горад...

Мужчыны ідуць дахаты, абмываюць нябожчыцу, тады заплятаюць ёй у лабковыя валасы нейкія ніткачкі... Грузяць голае цела, загорнутае ў коўдру, у машыну... Некуды вязуць... І раптам разумееш, пра што гэты фільм. Што гэтыя героі — ні разу не рускія, не праваслаўныя і ўвогуле не хрысціяне. Яны — мера.

Памятаеце летапіснае: чудзь, весь, мера... Насамрэч у энцыклапедыях значыцца, што мера вымерлі. Але ў фільме і аповесці ёсць людзі, якія лічаць сябе мера.

У іх адабралі ўсё. Яны абруселі, забылі сваю мову, сваіх багоў. Але ў іх іншае мысленне. Засталіся яшчэ традыцыі — вяселлі, пахаванні, — і яны трымаюцца іх, нягледзячы ні на што...

Яны не вымерлі 400 гадоў таму. Яны жывуць між рускімі.

Так, народ знішчыць немагчыма. Адна з традыцый мера — нябожчыкаў спальваюць, а попел высыпаюць у ваду. Бо мера вераць у ваду. Яна — іх рай, дзе нябожчыкі набываюць новыя целы... Рыбіныя. Пад'язджаючы да Волгі, кажуць спакойна так: вялікая меранская рака...»

Удавец дарогай расказвае кранальныя, вельмі інтымныя, драбніцы са свайго жыцця.

Разам з нябожчыцай, паводле старой традыцыі, яны вязуць дзвюх аўсянак. Шэрыя такія птушачкі, лясныя вераб'і. Кульмінацыя карціны — пахавальнае вогнішча на беразе Акі.

Фільм поўны эротыкі. Але «фільм паэтычны, — піша Рублеўская. — А публіка наша! Адны выраслі на савецкім кіно, другія — на блокбастарах. Бачаць голую бабу — ай-яй-яй, рэжысёр распусту прапагандуе! Не адчуваюць галоўнага».

Па дарозе назад аўсянкі, апынуўшыся ў салоне аўтамабіля вонкі клеткі, узлятаюць перад тварам Мірона, які за рулём, — і машына злятае з моста ў Волгу. Галоўныя героі гінуць. Але патануць, згодна з меранскай верай, — значыць набыць несмяротнасць.

Рублеўская пабачыла ў «Аўсянках» заклік «захоўваць аўтэнтычнасць народа. Захоўваць культуру і мову. Чалавечую годнасць, свабоду творчасці і мыслення».

Тыя самыя ідэі яна знайшла і ў іншых карцінах фестывалю: «З таго, што я пабачыла на «Лістападзе», фільм «Асадне» быў пра русінаў, фільм «Качагар» — пра якутаў, «Аўсянкі» — пра мера. Паказана, як народы выміраюць. Страчваюць аўтэнтычнасць, змагаюцца за яе да апошняга».

«А нашым — што публіцы, што журы — гэты падтэкст няўцямны, — з горыччу піша аглядальніца. — Бо ў іх не баліць за беларускае. За сваё. Чалавек, якому не баліць за сваё, ніколі не зразумее чыйгосьці болю за іншую культуру. Затое калі паказалі фільм Лазніцы «Шчасце маё», гледачы на прэс-канферэнцыях накідаліся на рэжысёра, што зганьбіў вобраз вялікай Расіі». І саркастычна дадае: «Салтыкова-Шчадрына і Гогаля, яны, напэўна, лінчавалі б».

**Мікола Бугай**

# Кустурыца: Хачу жыць пры салодкай дыктатуры

Сусветна вядомы рэжысёр сустрэўся з Лукашэнкам.

Але балканскі рэжысёр выключыў, што будзе здымаць фільм пра кіраўніка Беларусі.

«Не думаю, што здолеў бы яго [фільм] зрабіць. Я здымаю, грунтуючыся на адчуваннях, дзе існуюць падставы для гэтага». Але знаёмствам з Аляксандрам Лукашэнкам застаўся задаволены. «Гэта была прыемная сустрэча, сустрэча з моцным чалавекам».

Рэжысёр выявіўся вялікім прыхільнікам беларускай мадэлі развіцця дзяржавы. «Я расказаў Лукашэнку аб эканамічных тэорыях адносна краін, якія пераходзяць з камунізму і сацыялізму ў капіталізм. Паводле гэтай тэорыі, чым павольней краіна рухаецца ў бок капіталізму, тым лепш гэтай краіне. Я вялікі прыхільнік вашай краіны, бо яна вельмі акуратна прымае капіталізм. І вельмі разумна гэта робіць, бо капіталізм — гэта змрок».

Кустурыца трымаецца левых поглядаў. Ён называе сябе «праваслаўным сацыялістам» і сумуе па сваёй вялікай краіне. «Яны [амерыканцы] адабралі Косава, разваліў Югаславію. Але гэта не назаўжды».

Пяць гадоў таму Кустурыца перайшоў з ісламу ў праваслаўе.

Каб адмежавацца ад зненавіднага капіталізму, у сваёй вёсцы рэжысёр стварыў уласны горад з дрэва. У ім ёсць, казаў Кустурыца, усе атрыбуты горада антычнай Грэцыі: «свой кінатэатр, царква, крама, амфітэатр, лазня». Праўда, грамадскі лад не адпаведны радзіме дэмакратыі: «Я там граданачальнік. Там проста ўсе адно аднаго любяць, таму няма патрэбы ў дэмакратыі. Тып кіравання ў маім горадзе можна назваць салодкай дыктатурай».




Пяць гадоў таму Кустурыца перайшоў з ісламу ў праваслаўе.

За такой дыктатурай Кустурыца бачыць будучыню. «Ёсць два вынікі новага кіравання светам: таталітарызм, які будзе апошняй ступенню капіталізму, ці ўлада Кітая. І ў адным, і другім выпадку не будзе дэмакратыі. Таму мая тэорыя — вялікае абяцанне будучыні чалавецтва».

Эмір Кустурыца не любіць ЗША. Мяркую, там няма культуры. «Людзі не могуць ідэнтыфікавацца з хмарачосамі. Яны павінныя ідэнтыфікавацца з духоўнасцю. Мы можам стаць аматарамі «Аватара», але навошта, калі ёсць фільм «Андрэй Рублёў»? Што з двух фільмаў уяўляе сабой паэму свабоды? «Аватар» — не. «Андрэй Рублёў» — магчыма, так».

І адзначае ўплыў расійскай культуры на сябе. «Я вырас на старых рускіх [савецкіх] фільмах любімых рэжысёраў Пудоўкіна і Даўжэнкі». Кажа, што пастаянна чытае расійскую класіку. А цяпер здымае фільм пра Фёдара Дастаеўскага.

Балканскі рэжысёр наведаў Мінск у межах кінафестывалю «Лістапад».

**Сяргей Макарэвіч**

# Савіцкага пахавалі побач з Быкавым




Не ўсе народныя мастакі падпісалі некралог па калегу.

10 лістапада ў Мінску на Усходніх могілках быў пахаваны Народны мастак Беларусі Міхаіл Савіцкі. Развітацца з ім у Дом афіцэраў прыйшлі міністр культуры Павал Латушка, намеснік старшыні Саюза мастакоў Рыгор Сітніца, архітэктар Уладзімір Дзяніскаў. Кіраваў арганізацыяй пахавання віцэ-прэм'ер Уладзімір Патупчык.

Франтавіка і вязня канцлагераў Міхаіла Савіцкага пахавалі з вайсковымі ўрачыстасцямі: была рота ганаровай варты, развітальныя словы казаў прадстаўнік Мінабароны генерал-маёр Аляксандр Гура, труну апускалі ў дол пад гукі дзяржаўнага гімна і салют.

Пахавалі Савіцкага побач з Быкавым і Мулявіным.

У жыцці мастак быў неадназначнай асобай. Многія яго калегі пахаванне праігнаравалі. Пад некралогам стаяць подпісы Аляксандра Лукашэнкі і найвышэйшых дзяржчыноўнікаў. З мастакоў падпісалі рэктар Акадэміі мастацтваў Міхал Баразна і чатыры народныя мастакі Беларусі: Гаўрыла Вашчанка, Леў Гумілеўскі, Георгій Паплаўскі, Уладзімір Стальмашонак.

У той жа час іншыя народныя мастакі Беларусі — Леанід Шчамялёў, Арлен Кашкурэвіч, Васіль Шаранговіч, Май Данцыг, Віктар Грамыка — сваіх подпісаў не паставілі.

**Сямён Печанко**

Больш пра Савіцкага — у №42 «НН».

# «Ляпіс Трубяцкой»: «Людзі жуюць людзей»

Гурт выклаў у інтэрнэт частку новага альбома.

Сінгл «Священный огонь» складаецца з трох песень — «Афрыка», «Зевс» і «Священный огонь».

«У песні «Зевс» мы давялі да абсурду адзін з галоўных «трэндаў» сучаснага мас-культу: сцвярджэнне за кошт прыніжэння альбо нават знішчэння навакольных, — тлумачыць фронтмэн «Ляпіса Трубяцкога» Сяргей Міхалок. — Чалавек — адзіны прадстаўнік жывёльнага свету, які можа знішчаць да сябе падобных не дзеля ежы і не ў парадку самаабароны, а проста так. Уключыце тэлевізар — усе шоу заснаваныя на тым, што нехта некага падседжвае, выціскае, ідзе па галовах... Людзі жуюць людзей».

У новых песнях адсутнічае візітоўка «Ляпісаў» — духавая секцыя. На такі эксперымент музыкі пайшлі асэнсавана.

**КМ**

# Балівар не вынесе двух

Піша **Віталь Тарас**.

Слова, як вядома, — вялікая сіла. Калі абыходзіцца з ім неасцярожна, эфект бывае камічным.

Андрэй Саннікаў і Уладзімір Някляеў заявілі аб тым, што яны заключылі паміж сабой «джэнтльменскае пагадненне». Усе СМІ падхапілі гэты выраз. Гучна, трапна, нестандартна ў плане палітычнай лексікі. Ёсць толькі адно маленькае «але» . Рэаліі жыцця, у тым ліку палітычнага, у Беларусі мала нагадваюць брытанскія, у якіх нарадзілася паняцце «джэнтльмен».

Словы «джэнтльменскае пагадненне» ў мяне выклікалі цэлую плойму асацыяцый, звязаных з англа-амерыканскай літаратурай. І яе, так бы мовіць, савецкай інтэрпрэтацыяй. Класічны твор — апавяданне О.Генры «Дарогі, якія мы выбіраем».

Але спачатку падам кароткую цытату з іншага апавядання знакамітага амерыканскага пісьменніка — «Фараон і харал». Герой яго, жабрак, разважае пра тое, што, чым атрымліваць дапамогу з рук філантропаў, дык лепей трапіць у турму. І вось чаму: «Як у Цэзара быў Брут, так і тут кожны дабрачынны ложак быў звязаны з абавязковай ваннай, а кожны кавалак хлеба атручаны бесцырымонным зазіраннем у душу. Ці не лепей быць насельнікам турмы? Там, канечне, усё робіцца паводле строга ўсталяваных правілаў, але затое ніхто не суне нос у асабістыя справы джэнтльмена».

Як бачым, і бомж можа адчуваць сябе джэнтльменам. Галоўнае — не лезці яму ў душу.

Што тычыцца крылатай фразы «Балівар не вынесе двух», яна стала вельмі папулярнай у СССР пасля выхаду на экраны камедыі Леаніда Гайдая «Дзелавыя людзі», пастаўленай паводле апавяданняў О. Генры.

Героі навелы «Дарогі, якія мы выбіраем» — Акула Додсан і Боб Тыдбал — абрабавалі паштовы цягнік. Конь Тыдбала зламаў нагу. На двух хаўруснікаў застаўся толькі адзін конь, на якога давялося ўзваліць мех з нарабаваным золатам ды асігнацыямі. Перад тым, як забіць свайго прыяцеля, Акула Додсан і прамаўляе сакраментальную фразу. Маўляў, выбару няма. Нічога асабістага.

На развагі пра той сюжэт мяне навялі выказванні ўдзельнікаў «джэнтльменскага пагаднення» падчас іх прэс-канферэнцыі ў Мінску. Абодва беларускія палітыкі далі ясна зразумець, што сяброўства сяброўствам, каардынацыя каардынацыяй, але ніводзін з іх ні пры якіх абставінах не здыме на выбарах сваю кандыдатуру на карысць суперніка. Прэзідэнцкае крэсла ж адно! А Балівар, вядома, не вынесе двух...

Дарэчы, старога каня з апавядання зусім не выпадкова клічуць Балівар. Дзеянне ў О.Генры адбываецца на Дзікім Захадзе паміж 1865—1890 гадамі. У той час у ЗША даволі папулярным было імя Сымона Балівара, лідара барацьбы за незалежнасць іспанскіх калоній у Лацінскай Амерыцы. Вядома, што ён вельмі любіў свайго каня па мянушцы Палома. Лічыцца, што менавіта гэты конь выяўлены на гербе... Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла.

У фільме «Дзелавыя людзі», між іншым, ёсць яшчэ некалькі цудоўных цытат, якімі айчынныя палітыкі могуць скарыстацца ў той або іншай сітуацыі. «А куды ж глядзіць прэзідэнт?!» «Мала таго, што містэр Дорсет — сапраўдны джэнтльмен, ён, па-мойму, проста транжыра, калі робіць нам такую шчодрую прапанову». (Размова пра выкуп захопленага бандытамі падлетка з навелы «Правадыр чырванаскурых».) Ну і ў выпадку найбольш экстрэмальнай сітуацыі: «У нас ёсць дзесяць хвілін, каб дабегчы да канадскай мяжы!»

На завяршэнне не адмоўлю сабе ў прыемнасці працытаваць мужчынскі часопіс Esquire, які піша аб тым, як павінен паводзіць сябе джэнтльмен.

Джэнтльмен ніколі не п'е больш за адзін кактэйль да вячэры.

Джэнтльмен не здымае пад сталом абутак і не фліртуе з дапамогай ног.

Джэнтльмен ні ў якім выпадку не стане піць у рэстаране піва з бутэлькі.

Джэнтльмен не ўжывае замяннікаў цукру.

Джэнтльмен не п'е ваду з кавалкам лайма ці лімона.

Джэнтльмен не пакідае свой мабільны тэлефон на стале.

Джэнтльмен ніколі не засоўвае сурвэтку за кашулю.

Джэнтльмен не стане маляваць на абрусе.

Джэнтльмен ніколі не раіць шэф-кухару, як яму лепей гатаваць.

# У вас будзе дзіця!



Піша **Аляксандр Ворвуль**.

У віры дзён нам няма калі думаць пра «высокае і вечнае». І толькі калі нам на вочы трапляецца штосьці выразна адрознае ад нашай штодзённасці, мы прыпыняемся ў задуменні…

Так спыняюць наш погляд вочы няшчаснага дзіцяці.

Ад нашага з вамі сённяшняга клопату пра іх залежыць тое, у якой супольнасці мы будзем жыць заўтра.

Рэспубліканскі банк дадзеных аб дзецях, якіх мяркуецца ўсынавіць, налічвае больш за 6 тысяч дзяцей-сірот і дзяцей, пазбаўленых бацькоўскай апекі. Усе яны выхоўваюцца ў дзіцячых дамах, школах-інтэрнатах, дамах дзіцяці… Іх аб'ядноўвае жаданне жыць у сям'і.

Дзеля ажыццяўлення права дзіцяці на выхаванне ў сям'і наша краіна прадугледжвае шмат мажлівасцяў:
- — усынаўленне;
- — перадача на выхаванне ў апякунскую сям'ю;
- — перадача на выхаванне ў прыёмную сям'ю;
- — арганізацыя «гасцявой» сям'і.

Найпрасцейшая з такіх магчымасцяў — «гасцявая» сям'я. Гэта прыём дзіцяці ў сям'ю на выходныя і вакацыйныя дні. Прыгатаваць ежу і памыць за сабой посуд, схадзіць у кіно разам з «братам», пагуляць у парку з «бабуляй і дзядулем» — вось тыя простыя рэчы, якія дазваляюць самотнай малечы набыць новы эмацыйны досвед, адчуць любоў.

Апякунская сям'я — сям'я, якая выконвае абавязкі па выхаванні дзіцяці. Мажлівасць стаць апекуном даецца паўналетнім дзеяздольным грамадзянам краіны і лічыцца дзейсным сродкам вяртання сям'і дзіцяці, пазбаўленаму бацькоўскай увагі, сваякамі гэтага дзіцяці.

Прыёмная сям'я — гэта сям'я, якая прымае на выхаванне дзяцей-сірот і дзяцей, пазбаўленых бацькоўскай апекі. Дзейнасць прыёмнай сям'і ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дамовай аб перадачы дзяцей на выхаванне і працоўнай дамовай. Выхавальнік, такім чынам, пераўвасабляецца ў працаўніка і выконвае абавязкі бацькі, дзякуючы якім атрымлівае ад дзяржавы штомесячны заробак у 600 тыс. рублёў, грашовую падтрымку на выхаванне дзіцяці ў памеры 350 тыс. рублёў, поўны сацыяльны пакет і штогадовы аплачаны адпачынак.

Усынаўленне — юрыдычны акт, паводле якога паміж выхавальнікам і выхаванцам паўстаюць такія ж правы і абавязкі, як і паміж бацькамі з дзецьмі. Дзіця робіцца паўнавартасным членам сям'і.

У Беларусі штогод усынаўляецца больш за 500 дзяцей, больш за 4 тыс. дзяцей прымаюцца ў сем'і пад апеку, у прыёмныя сем'і і дзіцячыя дамы сямейнага тыпу.

У свядомасці беларусаў замацоўваецца думка, што ў нашай нацыі не павінна застацца дзяцей-сірот. Што гэта як клопат дзяржавы, так і справа грамадства.

Далучайцеся!

**Даведацца пра свае мажлівасці спраўдзіць мару дзіцяці-сіраты аб выхаванні ў сям'і вы можаце па тэлефоне (017) 284-71-51 ці на старонцы www.child.of.by Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.**

**РАЗБЯРЫЦЕСЯ!**

## Рамонт «Карабля» працягнецца яшчэ тры гады

У Рэдакцыю прыйшоў ліст ад студэнткі БНТУ, якая прасіла не раскрываць свайго імя. У лісце гаворка ішла пра скрутныя ўмовы навучання. У корпусе №15 Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, што вядомы мінчукам як «Карабель», ужо два гады ідзе рамонт. Вынік — развал у будынку і холад у аўдыторыях.

«Карабель» быў збудаваны ў 1983 годзе і адразу ўвайшоў у спіс самых незвычайных будынкаў на тэрыторыі СССР за падабенства да акіянскага лайнера.

Рамонт у «Караблі» пачаўся ў 2008 годзе. Хол корпуса выглядае прыстойна: тэлеэкраны, шапік, мазаіка на сцяне... Гардэроб амаль пусты. Чаму студэнты не пакідаюць паліто, мы дазналіся на вышэйшых паверхах.

У «носе» «Карабля» тэмпература трошкі вышэйшая за вулічную. Зламаныя кавалкі сцяны паміж мужчынскай і жаночай прыбіральняй дазваляюць як мінімум паціснуць руку чалавеку ў суседнім памяшканні...

Намеснік прарэктара па адміністратыўнай частцы Валер Фядотаў растлумачыў сітуацыю так: «Летам была магчымасць рабіць рамонт — не было грошай. Грошы з'явіліся — ужо верасень. У навучальных аўдыторыях мы падваконняў не ставілі: там будзе нейкая іншая тэхналогія. Дык і не вельмі ў нас і холадна — у маім кабінеце цяпер 17 градусаў, а ён — самы халодны. Трэба пацярпець: рамонт працягнецца гады тры як мінімум».

**Юрась Ускоў**

**ВОДГУКІ**

### Хрэн і рэдзька

**Прачытаў у №36 праграмныя заявы У.Някляева. І што ж?**

«Някляеў-прэзідэнт за строгае выкананне ўсіх міждзяржаўных пагадненняў з Расіяй, якія забяспечваюць паміж краінамі адсутнасць мытных, візавых абмежаванняў і свабоднае перамяшчэнне грамадзян, тавараў і капіталаў. Бо Расія для значнай часткі нашага насельніцтва — крыніца існавання».

То бок Някляеў — за паглынанне Расіяй Беларусі, бо беларуская эканоміка строга савецкага ўзору не можа канкураваць з расійскай. Скупяць за нафтадаляры ўсё, ад калгаснай зямлі да самога прэзідэнцкага палаца, а беларусы стануць прыгоннымі.

А чаму Расія для значнай часткі нашага насельніцтва — крыніца існавання? Чаму Някляеў пагаджаецца з тым, што гэтая значная частка едзе на заробкі ў Расію, а адтуль многія вяртаюцца ў трунах?

Чаму б не пачаць з таго свой выступ, каб нашы людзі не ехалі ў іншыя краіны працаваць, а наадварот, у Беларусь ехалі на заробкі.

Прапанаваў прачытаць артыкул жонцы. Потым запытаўся, якое ўражанне. Адказала: няма канкрэтыкі. Я гавару — канкрэтыка ў канцы артыкула. Някляеў збіраецца ісці ў Маскву па той жа дарозе, што і Лукашэнка.

Даражэнькі братка Някляеў, здымай сваю кандыдатуру на пасаду прэзідэнта. Змарнуеш сабе гады творчай працы, калі апынешся ў крэсле прэзідэнта. Карысці Беларусі больш прынясеш як пісьменнік.

Уся гэтая гоп-кампанія прэтэндэнтаў у прэзідэнты сабралася, як тыя падлеткі, гуляць з Лукашэнкам у хакей, а Лукашэнка клюшак не даў — адкрытага падліку галасоў, допуску да сродкаў інфармацыі.

Пры такім разбродзе ў апазіцыйных шэрагах Лукашэнка толькі ўсміхаецца і заяўляе аб упэўненай перамозе.

Шаноўныя прэтэндэнты на крэсла прэзідэнта! Дзе ваша заява аб справядлівасці на гэтай грэшнай зямлі? Чаму ніхто не ўспамінае, што сялян абрабавалі саветы, забралі іх зямлю, жывёлу, пабудовы? Чаму не гавораць аб вяртанні маёмасці сялянам і іх спадкаемцам? Калі ідзе гаворка аб прыватызацыі прадпрыемстваў, то чаму гэтая прыватызацыя не народная праз выдачу акцый рабочым і службоўцам?

Ад бацькоў чуў показку: калі з пана пан, то валы аддасць, а калі з мужыка пан, то не. Так што калі Лукашэнка, скарыстаўшы гістарычны момант, выскачыў з гразі ў князі, то ні ў якім разе ўлады добраахвотна не аддасць. І Расія Лукашэнку не здасць. Гэта яе стаўленік. Так, пасцябалі хлопца розгай, паказаўшы фільм «Хросны Бацька», каб быў болей паслухмяным і не рабіў выбрыкаў.

Чаму не гаворыцца аб тым, чаго не выканаў Лукашэнка ў сваіх абяцанках, не вярнуў грамадзянам грошы па ўкладах, што растаптаў і годнасць, калі даваў загад збіваць калег-дэпутатаў у парламенцкай зале, калі разагнаў абраны законам парламент, праводзіў ганебныя рэферэндумы?

Апазіцыя можа ўдзельнічаць у выбарах прэзідэнта, толькі калі выбары адкрытыя і свабодныя.

Перамагчы, як слушна гаварыў Пазняк, можна толькі байкотам.

**Мікола Валошчык,**
**Белаазёрск**

### Лупяць грошы са студэнтаў

**У Мазырскім педуніверсітэце існуе дзіўная практыка спагнання грошай са студэнта за прапушчаныя заняткі.** Універсітэту спусцілі прамфінплан, і выкладчыкі мусяць думаць, як зрабіць студэнта малапаспяховым, каб злупіць грошы за дадатковыя заняткі. Дзесьці каля 16000 за занятак. У Парыжы за такое палілі б тралейбусы, а ў нас — падцяць хвасцец і зубрыць далей!

У школы тэж спусцілі план па платных факультатывах. Не адукацыя, а даходны дом!

Гэта ж неверагодная подласць!

А наконт «Пінскдрэва»… У нас антычалавечая сістэма. Улада не наша. Яна бязлітасная.

**Мікалай Бусел, Дуброва**
**(Светлагорскі раён)**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

# Яны яшчэ і пішуць



Паэтка Віка Трэнас — завейны месяц люты.

Выходзіць эратычны «Сучасны беларускі каляндар». З пісьменніцамі.

Стварылі яго рэкламнае агенцтва «Іксэлент» і друкарня «Паліпрынт». Як кажуць выдаўцы, гэта не звычайны для іх эратычны каляндар. Ён зроблены, каб падтрымаць цікавасць да беларускай культуры.

І сапраўды, многія мужчыны, пабачыўшы на фота веі літаратурнага крытыка або аголеныя плечы паэткі, пабягуць у кнігарні, каб даведацца, пра што ж такія красуні пішуць.

Гэта не першы ў Беларусі эратычны праект з вядомымі асобамі.

Летась кандытарская фабрыка «Спартак» запрасіла знешца ў сваім фірмовым календары баскетбалістак зорнай нацыянальнай зборнай. Каляндар выйшаў шакаладна-спартовы: шакаладныя адценні целаў і мячы.

Грошай не плацілі — абяцалі кожнай па дзесяць календароў.

Літаратурна-музычная эротыка «Сучаснага беларускага календара» інакшая. Тут болей вэлюму, празрыстасці, метафар — аж да класічных, накшталт каласоў пад сярпом (гл. месяц жнівень).

Летась выдаваўся і каляндар з аголенымі мужчынамі-літаратарамі — «Канец словаў». Праўда, выйшаў ён не эратычны, а хутчэй нудысцкі — зважаючы на шматгадовы досвед і літаратурную вагу многіх персанажаў. У календарах з паэткамі нуды меней, а эротыкі болей. Таму ён можа мець камерцыйны поспех.

Як прызналася наша крыніца ў «Сучасным беларускім календары», грошай за здымкі не плацілі. Абяцалі кожнай у якасці ганарару па дзесяць асобнікаў календара. Хочаш — прадавай, хочаш — папулярызуй.

**Сяргей Мікулевіч, КМ**

**Для календара зняліся:**

студзень — **Тамара Лісіцкая** (радыёвядучая, пісьменніца)

люты — **Віка Трэнас** (паэтка)

сакавік — **Дыяна Балыка** (паэтка, драматург)

красавік — **Алена Ермаловіч** (паэтка)

май — **Наталля Батракова** (пісьменніца)

чэрвень — **Света Бень** (спявачка)

ліпень — **Вольга Тарасевіч** (пісьменніца)

жнівень — **Вольга Гапеева** (паэтка)

верасень — **Вольга Акуліч** (спявачка)

кастрычнік — **Яўгенія Пастарнак** (пісьменніца)

лістапад — **Валерыя Кустава** (паэтка)

снежань — **Ганна Альхоўская** (пісьменніца)

ЗА ГРОШЫ

## Шоу ў пінскім супермаркеце

На свабодным інтэрнэт-сэрвісе youtube, дзе можна глядзець самае рознае відэа, з'явіўся пікантны сюжэт з Пінска.

Відэа аматарскае. Найхутчэй, знятае на мабільны тэлефон. На ім бачна, як цалкам аголеная дзяўчына заходзіць у адзіны пінскі супермаркет, прагульваецца паўз касы і чэргі пакупнікоў і толькі пасля заўвагі ахоўніка пакідае краму. Людзі рэагуюць на такое дзіва досыць спакойна. А мо проста слупянеюць — гэта немагчыма разабраць з прычыны дрэннай якасці відэа.

Як паведамілі «Еўрарадыё» сведкі флэш-мобу, гэтая дзяўчына пабілася аб заклад на пяць тысяч еўра, што зойдзе галяком у супермаркет. І выканала сваю частку дамовы. Прычым сведкам яе дэфіле, дзякуючы сучасным тэхналогіям, зрабілася паўкраіны.

Такія яны — сучасныя тэхналогіі. І сучасныя жарты.

**СМ**

ГУЧНАЯ СПРАВА

## Банкаўскас пагарэў на бензіне

Наркотыкі не перавозіў, але этыку парушыў.

Дэпартамент паліцыі Літвы паведаміў, што ротны камандзір муніцыпальнай коннай паліцыі Літвы Лаймонас Банкаўскас не перавозіў наркотыкаў, аднак парушыў этыку.

«З прычыны, што з Беларусі не паступіла дадатковай інфармацыі, няма падставаў сцвярджаць, што Банкаўскас здзейсніў злачынства», — сказаў журналістам кіраўнік Дэпартамента Упраўлення ўнутраных расследаванняў паліцыі. Пра гэта піша літоўскі партал delfi.lt.

Выявілася, што Банкаўскас ездзіў у Беларусь па таннейшы бензін. Магчыма, беларускія спецслужбы хацелі на гэтым сыграць і сталі яго шантажаваць.

Па словах Чыжунаса, гэта не першы выпадак, калі Банкаўскас парушае службовую этыку. У дачыненні да яго праводзілі яшчэ чатыры службовыя праверкі.

**Мікола Бугай**

ЗДАРОЎЕ

## Улады Вашынгтона забаранілі продаж энергетыкаў

Напоі кшталту Burn ці RedBull шкодзяць.

З 17 лістапада ў амерыканскім штаце Вашынгтон афіцыйна ўступіць у дзеянне забарона на продаж энергетычных напояў, паведамляе Alco News. На сёння такая забарона ўжо дзейнічае ў Мічыгане, Юце і Аклахоме.

Гэтае рашэнне ў Вашынгтоне прынялі з прычыны таго, што ў мінулым месяцы дзевяць студэнтаў Цэнтральнага ўніверсітэта Вашынгтона трапілі ў лякарню пасля ўжывання такога напою на вечарынцы.

**КаМ паводле Alco News**

ТЭХНАЛОГІІ

## У Беларусі з'явіцца сотавая сувязь 4-га пакалення

Адпаведны ўказ падпісаны 9 лістапада.

Гэта дасць магчымасць ажыццявіць якасны скачок у развіцці тэлекамунікацый, забяспечыць хуткасці перадачы звестак па радыёканалах, параўнальныя са скарасцямі перадачы для оптавалаконных ліній сувязі, што значна павялічыць ахоп насельніцтва шырокапалосным доступам у інтэрнэт і прывядзе да змяншэння яго кошту.

**МБ**

РУХ НАПЕРАД

## З Мінска ў Вільню за дзве гадзіны

Паміж Літоўскай і Беларускай чыгункамі дасягнутая дамоўленасць аб арганізацыі хуткаснага цягніка між сталіцамі.

Рэалізацыя гэтага праекта мае завяршыцца ў 2013.

Паездка на хуткасным цягніку зойме 2 гадзіны. Мытны і памежны кантроль будзе адбывацца не на мяжы, а падчас пасадкі і высадкі ў Мінску і Вільні.

**Lietuvos rytas**

## Польшча хоча змяніць «урачоў» на «дактароў»

«Давайце заменім савецкага «ўрача» еўрапейскім «доктарам», — прапануе польская Галоўная медыцынская рада, якая хоча ўнесці змены ў тытулаванне выпускнікоў медыцынскіх навучальных установаў.

Калісьці ў Польшчы ўжо лячылі «дактары», але ў савецкія часы іх замянілі на «ўрачоў», — кажа старшыня Галоўнай медыцынскай рады Мацей Гаманкевіч і дадае, што трэба адаптавацца да новых рэаліяў: — Мы — сябры Еўрапейскага саюза, а там выкарыстоўваецца назва «доктар».

На думку прадстаўнікоў прафесіі, гэта не толькі моўная праблема. Польскія дактары маюць сур'ёзныя праблемы за мяжой, калі ім даводзіцца лячыць замежнікаў.

«Для швейцарца ці француза «ўрач» — гэта горш, чым «доктар», — тлумачыць Гаманкевіч, дадаючы, што замена «ўрача» на «доктара» падвысіла б прэстыж прафесіі.

**КаМ паводле wiadomosci.gazeta.pl**

ОБШЧАПАНЯТНЫ

## У Мінску адкрыўся дзіцячы англійскі клуб

Англійскі дзіцячы клуб Global Child — першае ў беларускай сталіцы месца, дзе ранняе развіццё дзіцяці ажыццяўляецца на англійскай мове.

Заняткі праходзяць у мініграпах. Праграма навучання Global Child працуе па брытанскай базавай дашкольнай праграме навучання The Early Years Foundation Stage, нацыянальнай праграме дашкольнай адукацыі Беларусі «Пралеска» і аўтарскіх праграмах на аснове Immersion Method (метад занурэння ў англамоўнае асяроддзе).

**naviny.by**

# «Украіна — не Аліна»

Падчас візіту Пуціна правакатыўную акцыю зладзіў рух «Фемен».

Актывісткі ўкраінскага жаночага руху «Фемен» знайшлі бяспройгрышны спосаб прыцягваць увагу да сваіх акцый. Яны агаляюцца ў людных месцах.




У дзень афіцыйнага візіту расійскага прэм'ер-міністра шэсць актывістак раздзеліся ля помніка Леніну ў Кіеве. Пры гэтым яны скандавалі лозунгі: «Пуцін, чапай палюбоўніцу, а не Украіну», «Нас так лёгка не нагнеш», «Крамлёўскім карузлікам не дамо», «Дзюдаіст, змагайся з іншымі», «Украіна — не Аліна» — намякаючы на чуткі пра раман Пуціна з гімнасткай Алінай Кабаевай.

Акцыя доўжылася дзесяць хвілін. Сярод гледачоў былі толькі журналісты і выпадковыя мінакі. Сярод праваахоўнікаў быў заўважаны «дашнік», які фатаграфаваў аголеных дзяўчат на свой мабільны тэлефон.

Як і пасля кожнай «фяменаўскай» акцыі, фота і відэа масава разышліся па інтэрнэце, што дало патрэбны для актывістак эфект.

Пасля міліцыя спрабавала прыцягнуць дзяўчат да адказнасці за «дэманстрацыю геніталій». Але суд вырашыў, што грудзі да геніталій не адносяцца і што акцыя прайшла ў рамках законаў Украіны.

**Сяргей Гезгала**




## ТЭНІС

### Азаранка—Вазняцкі: дабрачынны матч

Першая ракетка свету Каралін Вазняцкі і дзясятая ракетка свету беларуска Вікторыя Азаранка **19 лістапада** згуляюць дабрачынны тэнісны матч **у мінскім Палацы спорту**. Грошы ад правядзення дабрачыннага матчу паступяць у Рэспубліканскі цэнтр дзіцячай анкалогіі і гематалогіі ў Бараўлянах. Акрамя таго, тэнісісткі выставяць на аўкцыён свае ракеткі і камплекты экіпіроўкі. Таксама ў праграме — аўтограф-сесія і майстар-клас. **Пачатак у 17.30.** Квіткі каштуюць ад 20 тыс. рублёў.

## КАНЦЭРТЫ

### Вайцюшкевіч — Караткевічу

**26 лістапада ў Палацы культуры чыгуначнікаў (Камсамольская плошча, 4) а 19-й** Зміцер Вайцюшкевіч запрашае на канцэрт, прысвечаны 80-годдзю Уладзіміра Караткевіча. **Пачатак у 19.00.**

### Прыедзе Therion

**30 лістапада на сцэне к/з «Мінск»** — канцэрт шведскага гурта Therion. Гэтыя музыкі лічацца заснавальнікамі стылю сімфа-метал. **Пачатак а 19-й.**

### Алег Хаменка

**24 лістапада ў «Лісінай нары» (вул.Каліноўскага, 32)** зайграе і заспяе лідар гурта «Палац» Алег Хаменка. **Пачатак а 19-й.**

### У чаканні Калядаў

**У Тэатры расейскага рамансa (вул.Чыгуначная, 27-2)** пройдуць вечары спеўнай паэзіі «У чаканні Калядаў». **18 лістапада** выступаюць **Зміцер Сідаровіч** і **Зміцер Бартосік. 19 лістапада — Кацярына Ваданосава, Яўген Барышнікаў** і гурт **Alta mente**. **20 лістапада — Вольга Акуліч** з праграмай «Трохкутнік». **25 лістапада — Ігар Загумённаў і гурт «Скрыжалі». Пачатак а 19-й.**




### Джаз у ДК прафсаюзаў

**23 лістапада ў Палацы культуры прафсаюзаў (пр.Незалежнасці, 25)** у рамках праекта «Джазавы мост» пройдзе сумесны канцэрт **Сачада Васандані**, які лічыцца найлепшым джазавым вакалістам Нью-Ёрка, і мінскага гурта **Apple Tea**. **Пачатак а 19-й.**

### Альпійскі джаз і беларускія спевы

**25 лістапада ў Моладзевым тэатры эстрады (вул.Маскоўская, 18а)** — канцэрт швейцарскага гурта **Albin Brun Alpin Ensemble** і беларускага **Akana NHS** (праект Русі). **Пачатак а 19-й.**

### Gods tower

**20 лістапада ў «Рэактары»** зайграе легенда металічнай музыкі Беларусі — гурт **Gods tower** з Гомеля. **Пачатак а 19-й.**

## ІМПРЭЗЫ

### Кніга Сяргея Кавалёва

**18 лістапада літаратурна-музычная гасцёўня ТБМ (вул.Румянцава, 13)** запрашае на прэзентацыю кнігі Сяргея Кавалёва «Шлях. Твары, думкі, галасы. Рыфмаваная гісторыя ў адценнях беларускага духу». Бяруць удзел: Уладзімір Арлоў, Ніна Кавалёва, а таксама саліст гурта «Стары Ольса», майстар і музыка Алесь Чумакоў. **Пачатак а 17-й.**

## ВЫСТАВЫ

### Не прапусціце Грунвальд у Мінску

У Мінску адкрылася мастацкая выстава, прысвечаная 600-годдзю вялікай бітвы. Алей, графіка, скульптура, кераміка, фота. Дзясяткі аўтараў — дзясяткі адлюстраванняў адной гістарычнай падзеі. Георгій Паплаўскі, Гаўрыла Вашчанка, Уладзімір Басалыга, Алесь Мара, Мікола Купава… Дубровенскае поле, князі і каралі ВКЛ, крыжакі ў цяжкіх латах, літоўскія ваяры, сутычкі з ворагамі. Усё гэта адлюстравана ў працах мастакоў. Выстава стала працягам леташняй, прысвечанай тысячагоддзю ад першай згадкі назвы «Літва». Выдатная выстава, выдатныя працы. **Да 21 лістапада ў Палацы мастацтва (вул.Казлова, 3).**

### Барыс Забораў

**Да 10 снежня ў Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** выстаўленыя 38 твораў жывапісу і скульптуры Барыса Заборава. Мастак нарадзіўся ў Мінску ў 1935-м, ад 1981 ён жыве ў Парыжы. Яго называюць беларускім мастаком, а сам Забораў лічыць сябе грамадзянінам сусвету, радзіма якога — Беларусь.

### Юдаль Пэн у Мінску

**У Музеі Якуба Коласа (вул. Акадэмічная, 5) да 21 снежня** працуе выстава партрэтаў і краявідаў Юдаля Пэна. У экспазіцыі — 23 працы майстра з калекцыі Віцебскага краязнаўчага музея. Акрамя таго, дэманструюцца 40 паштовак з краявідамі Віцебска пачатку XX стагоддзя.

### Ян Шматлох і вучні

**У Галерэі Акадэміі мастацтваў (вул.Сурганава, 14)** працуе выстава «Ян Шматлох і вучні». На ёй прэзентаваныя творы, выкананыя ў тэхніцы глыбокага друку. Гэтая тэхналогія, што вядзе свой радавод ад сярэднявечнай гравюры, дазваляе ствараць аб'ёмныя, рэльефныя малюнкі. У адкрыцці бярэ ўдзел прафесар Ян Шматлох, кіраўнік майстэрні глыбокага друку Катавіцкай акадэміі мастацтваў (Польшча).

### З дрэва, гліны і металу

**Да 5 снежня ў Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12)** працуе выстава твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «З дрэва, гліны і металу», дзе прадстаўленыя творы трох мастакоў: Андрэя Мяцельскага, Генадзя Саваня, Аляксандра Паўлава. Работы выкананыя з трох непадобных матэрыялаў і ў розных тэхніках — мастацкая кераміка, чаканка і ліццё, а таксама разьба па дрэве.

### Супраць смяротнага пакарання

**Да 11 снежня ў Музеі гісторыі вайны (Кастрычніцкая плошча)** працуе выстава «Смерць — гэта не правасуддзе». Выстава мае на мэце паказаць, што смяротнае пакаранне мусіць быць скасаванае.

## ТЭАТРЫ

**17 лістапада**

**Зніч** — «Пра ката Сафрона і пеўніка Андрона»
**Купалаўскі** — «Офіс»
**Купалаўскі** — «Тэатраманія»
**Горкага** — «Адзіны спадкаемца»
**Беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»
**Оперы і балета** — «Папялушка»

**18 лістапада**

**Горкага** — «Злоўлены сеткай»
**Беларускай драматургіі** — «Жанчыны Бергмана»
**Оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»

**19 лістапада**

**Зніч** — «Пачакай, сонца!»
**Беларускай драматургіі** — «Адвечная песня»
**Лялек** — «Дом, які пабудаваў Свіфт»
**Горкага** — «Ідэальны муж»
**Оперы і балета** — «Лебядзінае возера»

**20 лістапада**

**Лялек** — «Жахлівы пан Ау»
**Горкага** — «Дзядзькаў сон»
**Юнага гледача** — «Трошкі пяшчотны»
**Беларускай драматургіі** — «Яго апошняе каханне (Лета)»
**Оперы і балета** — «Баль-маскарад»

**21 лістапада**

**Лялек** — «Чароўная лямпа Аладзіна»
**Юнага гледача** — «Брык і Шуся шукаюць лета»
**Оперы і балета** — «Беласнежка і сем гномаў»
**Горкага** — «Расейскія вадэвілі»
**Беларускай драматургіі** — «Адамавы жарты»
**Юнага гледача** — «Трошкі пяшчотны»
**Горкага** — «Царэўна-жабка»
**Оперы і балета** — «Мадам Батэрфляй»

**22 лістапада**

**Купалаўскі** — «ГендэльБах»
**Беларускай драматургіі** — Вечар сучаснай харэаграфіі
**Купалаўскі** — «Вячэра з прыдуркам»

**23 лістапада**

**Юнага гледача** — «Ліса і вінаград»
**Беларускай драматургіі** — «Дзённік паэта (Інтымны дзённік)»
**Горкага** — «Эсфір»
**Оперы і балета** — «Іаланта»

**24 лістапада**

**Купалаўскі** — «Офіс»
**Беларускай драматургіі** — «Чайка»

**25 лістапада**

**Беларускай драматургіі** — «Містар Розыгрыш»
**Купалаўскі** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Горкага** — «Ніначка»

**26 лістапада**

**Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»
**Лялек** — «Гісторыя аднаго горада»
**Беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»
**Купалаўскі** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Юнага гледача** — «Сіні аўтамабіль»

## КІНО

### Выдатніца лёгкіх паводзінаў

**Easy A**
ЗША, 2010, каляровы, 92 хв.
**Рэжысёр:** Уіл Глак
**Жанр:** камедыя/меладрама
Толькі ад 16 гадоў.

Фільм даводзіць, што чуткі пра распуснасць цяперашняй моладзі моцна перабольшаныя.

Даўганогая Аліў (Эма Стоўн) — не замызганая пачвара, а прыгажуня ў модным прыкідзе. Але гэтага ў наш час замала: аднакласнікі не запамінаюць яе імя, а хлопцы глядзяць на яе як на пустое месца. Сітуацыю зменіць выпадковая мана: зманіўшы сяброўцы, што страціла цнатлівасць, Аліў робіцца зоркай — плётка разлятаецца па школе, і дзяўчыне прысвойваецца ганаровае званне галоўнай распусніцы акругі. У гэтай папулярнасці выяўляюцца як прыемныя плюсы, так і бадзёвачныя мінусы.

«Выдатніца лёгкіх паводзінаў» — камічнае пераасэнсаванне рамана «Пунсовая літара» Натаніэля Готарна. Драма жанчыны, якая дазволіла свайму асабістаму жыццю выйсці за рамкі грамадскіх уяўленняў пра прыстойнасць, нешта накшталт амерыканскай «Мадам Бавары». Нават выйшлі яны прыкладна ў адзін і той жа час, кніга Готарна ў 1850, а раман Флабера — у 1856. «Пунсовая літара» ў Штатах уваходзіць у школьную праграму.

Фільм не асучаснівае «Пунсовую літару». Кніга Готарна тут робіцца хутчэй адпраўным пунктам для размовы пра разбэшчанасць, пурытанства і трохі пра літаратуру. Карыстаючыся школьнымі тэрмінамі, «Пунсовая літара» — тэма сённяшняга ўрока, як у пераносным, так і ў наўпростым сэнсе: кнігу ў фільме абмяркоўваюць у класе, і менавіта з яе Аліў пазычыць ідэю ў якасці пратэсту начапіць на свой строй чырвоную «А».

Поспех «Выдатніцы» грунтуецца на тым, што Глак падабраў ідэальны тон для кіно пра старшакласнікаў.




З аднаго боку, фільм праўдападобны на ўзроўні лексікі і дыялогаў, з іншага — не перагінае палкі. Глак глядзіць на падлеткаў не з жахам «Дзетак» Лары Кларка, а з гумарам і замілаваннем «Кепскіх дзяўчатак» і «Суперперцаў». Погляд Глака — гэта погляд прагрэсіўных бацькоў Аліў, якія не чырванеюць ад слова «сэкс», памятаюць, што калісьці былі такімі ж, і ведаюць страшную таямніцу: чуткі пра распуснасць падлеткаў моцна перабольшаныя, яны больш гавораць пра распусту, чым распусьнічаюць.

**Gazeta.ru**

### Рэтраспектыва фільмаў Анджэя Вайды

**У кінатэатры «Перамога» ад 22 да 30 лістапада** — рэтраспектыва фільмаў польскага рэжысёра Анджэя Вайды.

22 лістапада — **«Дантон»**.
23 лістапада — **«Зямля абяцаная»**.
25 лістапада — **«Панны з Вілька»**.
26 лістапада — **«Усё на продаж»**.
27 лістапада — **«Чалавек з мармуру»**. Пачатак у 18.30.
28 лістапада — **«Пан Тадэвуш»**. Пачатак у 18.30.
28 лістапада — **«Корчак»**.
30 лістапада — **«Катынь»**.
**Пачатак сеансаў а 19-й.**

# «У яго магутны кідок»

Галоўны трэнер мінскага хакейнага клуба «Дынама» Марэк Сікора ангажаваў у каманду свайго аднафамільца Пятра — уладальніка Кубка Стэнлі.



Часам Пётр Сікора нават ламае клюшку.

«Дынама» няблага выступае ў чэмпіянаце Кантынентальнай хакейнай лігі. Зараз каманда займае 5-е месца ў Заходняй канферэнцыі чэмпіянату і мае на рахунку 40 балаў. Адрыў ад ЦСКА, якое займае 9-е месца, складае 11 балаў. Але маскоўскі клуб пакуль згуляў на тры гульні меней.

«Я вельмі задаволены набранымі сарака баламі», — зазначыў на прэс-канферэнцыі трэнер «Дынама» Марэк Сікора. Ён панаракаў на каляндар чэмпіянату, складзены так, што мінскія заўзятары не пабачаць каманду да канца восені. Наступны матч «Дынама» згуляе на «Мінск-Арэне» толькі 30 лістапада. Апошнія тры хатнія сустрэчы «Дынама» гуляла ў Бабруйску — «Мінск-Арэна» цяпер рыхтуецца да дзіцячага «Еўрабачання».

Галоўны трэнер не разумее, чаму «Мінск-Арэну» аддадуць пад трэніроўкі толькі 28 лістапада, калі «Еўрабачанне» пройдзе 20 лістапада.

Мы ж у XXI стагоддзі жывём, не патрэбны той тыдзень для падрыхтоўкі лёду, у сэрцах кінуў Сікора, якому хочацца вывесці сваіх хлопцаў на пляцоўку ўжо 25-га.

Трэнер-чэх Сікора ангажаваў у «Дынама» яшчэ аднаго чэха. І таксама Сікору. Кантракт з Пятром Сікорам быў падпісаны на тым тыдні. Марэк Сікора зазначыў, што ведае гульца з шаснаццацігадовага веку. І пад яго кіраўніцтвам Пётр рабіў першыя крокі ў хакеі. Цяпер Пётр Сікора — двухразовы уладальнік Кубка Стэнлі (другі раз у 2009-м у складзе «Піцсбурга»).

Поспех «Дынама» — плэй-оф плюс праходжанне раўнда турніру.

«У яго вельмі магутны кідок — гэта яго галоўны козыр. Ён можа гуляць і з краю, і з цэнтра, ён удзяляе ўвагу ў рэалізацыі большасці (сітуацыя, калі каманда на пляцоўцы мае колькасную перавагу — Рэд.) і шмат забіваў, а ў нас рэалізацыя большасці кульгае», — зазначыў трэнер. Найхутчэй П.Сікора будзе гуляць у 2-м звяне, а ў першым траўмаванага капітана Ёзафа Штумпела заменіць Сяргей Варламаў. Штумпел, распавёў Сікора, не зусім задаволены сваімі капітанскімі абавязкамі — яму б хацелася больш канцэнтравацца на гульні. Капітанам «Дынама», лічыць трэнер, мог бы быць Віктар Касцючонак, які мае неабходныя байцоўскія якасці і вопыт капітанства ў «Амуры». Праўда, Касцючонак выбыў на два месяцы з прычыны траўмы. Таксама галоўны трэнер задаволены «набыццём» новага брамніка Роберта Эша.

Марэк Сікора ўсцешаны вялікай наведвальнасцю «Мінск-Арэны», выказаў спадзеў, што рэкорд КХЛ, усталяваны на матчы з «Ак Барсам» (21 верасня — аншлаг, 15 531 гледачы), — не апошні.

Каментуючы чуткі пра свой магчымы сыход з трэнерскай пасады пры канцы сезона, Сікора зазначыў: «Калі будзе поспех — то трэба думаць, калі не — трэба сканчаць з працай».

Што такое поспех? «Поспех «Дынама» — плэй-оф плюс праходжанне аднаго раўнда турніру», — мяркуе чэшскі спецыяліст.

Два мінулыя сезоны «Дынама» не магло прабіцца ў плэй-оф, летась яно фінішавала на 11-м месцы ў Заходняй канферэнцыі, страціўшы нават тэарэтычныя шанцы за пяць тураў да канца чэмпіянату. «Дынама» ў мінулым сезоне трэніраваў Глен Хэнлан, а пасля яго звальнення 20 кастрычніка 2009 г. — Аляксандр Андрыеўскі.

Кантынентальная хакейная ліга — гэта спаборніцтва 23 каманд, 20 з іх расійскія, плюс мінскае і рыжскае «Дынама» і «Барыс» (Астана).

**Алег Гардзіенка**

**Наступныя матчы «Дынама»**

17 лістапада — з «Трактарам»,
19-га — з «Салаватам Юлаевым»,
21-га — з магнітагорскім «Металургам»,
23-га — з «Атлантам» (усе — у гасцях).

30 лістапада з клубам «Сібір», 2 снежня — з «Амурам», 4 снежня з новакузнецкім «Металургам» (у «Мінск-Арэне»). Ад 22-га да 29-га снежня ў Мінску таксама запланаваныя чатыры гульні.




Ці застанецца Марэк Сікора трэнерам «Дынама»? Пакажуць вынікі чэмпіянату.

Сапраўдная беларуская кухня

## Сезон трусоў

### Фаршыраваны трус

1 трус, 250 г свіной карэйкі або вяндліны, 1 цыбуліна, 1 пячонка труса або зайца, 100 г белага хлеба ці ½ шклянкі цёртых сухароў, 3 ст. лыжкі сечанай зеляніны, 3 ст. лыжкі тлушчу, ½ л булёну або вады, ½ шклянкі віна ці кіслага соку, 2—3 ст. лыжкі смятаны, 1 ст. лыжка мукі, соль, чорны і чырвоны молаты перац, гарчыца да смаку.

Свініну разам з цыбуляй, пячонкай і размолатым белым хлебам прапусціць праз мясарубку. Атрыманы фарш тушыць, дадаўшы прыправы, сечаную зеляніну і крыху вадкасці.

Тушку ачысціць, нацерці ўнутры соллю, перцам і гарчыцай. Напоўніць фаршам брушную поласць труса, зашыць. Мяса падпячы з усіх бакоў на патэльні, пасля чаго яго можна тушыць ці смажыць. У абодвух выпадках варта падтрымліваць умераную тэмпературу, каб мяса было гатова толькі праз дзве-тры гадзіны. Падчас тушэння мяса павінна быць напалову пагружанае ў вадкасць, падчас смажання праз кожныя 10 хвілін яго трэба паліваць. Для гэтага з галавы і ног труса трэба зварыць булён, дадаць да яго кіслы сок, смятану і прыправы. Мяса можна падаваць у гарачым і ў халодным выглядзе.

**НБ**

## Прыватныя абвесткі

**ВІТАННІ**

**Віншую Вавана Кандратовіча** з днём народзінаў! Мае шчырыя ад сэрца віншаванні табе! Магутнага здароўя, добрых і прыемных падзей у жыцці, канечне, удачы — яе заўсёды не хапае! Андрусь.

**СПАЧУВАННІ**

**Выказваем спачуванні Вользе Хвоін** з прычыны смерці мамы. Сябры і калегі.

**Выказваем спачуванні Паўлу Касцюкевічу** з прычыны смерці дзеда. Сябры і калегі.

**СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ**

**Шукаем аднадумцаў** для падарожжа 21 лістапада па маршруце: Лукавец—Стайкі—Мацькаўцы—Альковічы—Старынкі—Абадоўцы—Асцюковічы—Вязынь—Латыгаль. Т.: 262-73-43, (029) 111-73-32.

**АДЗЕЖА**

**Дапамагу ў стварэнні** паўсядзённай і святочнай адзежы. Наталля. Т.: (029) 353-73-06.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) Дзве дзяўчынкі зайшлі ў краму, каб купіць набор фламастараў. У адной не хапае для пакупкі 1 тысячы рублёў, а ў другой 25 тысяч рублёў. Нават склаўшыся, яны не змогуць купіць фламастары. Колькі каштуюць фламастары?

2) Дзядуля даў унуку палову сваіх ігрушаў. Калі ён аддаў унуку яшчэ паўгрушы, то ў яго засталося 2 грушы. Колькі грушаў было першапачаткова ў дзядулі?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**

ЗДАРОЎЕ

# Мінск рыхтуецца да грыпу

Прышчэпка ад грыпу дзейнічае 2—3 месяцы. Сёлета пік сезоннай пошасці чакаецца ў студзені. Па Мінску ідуць чуткі, што прывівак і лекаў, як і летась, будзе не ставаць.

Дактары не заўжды рэкамендуюць рабіць прышчэпкі, асабліва людзям з алергіяй на медпрэпараты. Але вакцыны карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Якую вакцыну выбраць?

У Мінску сёлета прышчэпліваюць чатырма: «Ваксігрып» (Францыя), «Флюарыкс» (Германія), «Грыпол плюс» (Расія), «Флюваксін» (Кітай). Усе, акрамя расійскай, — гэта спліт-вакцыны, у якія ўваходзяць не толькі знешнія, але і ўнутраныя антыгены, і дапамагае такая вакцына не ад аднаго віду грыпу, а адразу ад некалькіх. Што карысна, не мае ў сабе ні жывога, ні забітага віруса.

Расійская вакцына мае толькі знешнія антыгены, таму і абарона ад віруса ў іх слабейшая. Такую вакцыну рэкамендуюць алергікам, а таксама дзецям і тым, хто прывіваецца ўпершыню.

У прыватных медцэнтрах можна знайсці «Ваксігрып» і «Флюарыкс». Першы каштуе 49 500, другі — 45 000 рублёў. У «Экамедсэрвісе», калі прыйсці туды сям'ёй (больш за тры чалавекі), можна атрымаць зніжку.

У дзяржаўных установах, як паведамілі ў Гарадскім цэнтры гігіены і эпідэміялогіі, прышчэпак яшчэ шмат — у некаторых паліклініках засталіся і бясплатныя (але толькі для людзей з групы рызыкі).

Цана на вакцыны розніцца ў паліклініках: надбаўка залежыць ад таго, ці робіць доктар агляд, а таксама ад катэгорыі доктара. У сярэднім па паліклініках «Ваксігрып» каштуе ад 30 да 32 тысяч, «Грыпол» — ад 20 да 23 тысяч. Гэтыя дзве вакцыны лічацца асноўнымі, у той час як у якасці бясплатнай прышчэпкі выкарыстоўваецца кітайскі «Флюваксін».

Пасля леташняга «дэфіцыту» людзей непакоіць наяўнасць лекаў у аптэках. Сярод найпапулярнейшых — арпетол, імунал, арбідол, аксалінавая мазь, і, асобна ад лекаў, — марлевыя павязкі.

Карысць аксалінавай мазі таксама шмат аспрэчвалася, але яна застаецца найпапулярнейшым сродкам супраць грыпу. Менавіта яна і знікла першай летась. Па афіцыйнай інфармацыі, аксалінавая мазь прадаецца амаль ва ўсіх аптэках горада. Астатнія прэпараты таксама можна знайсці. Нават марлевыя павязкі, запэўніваюць у аптэках, сёлета ёсць у дастатковай колькасці.

**Юрась Ускоў**




**Кампанія «Гавары праўду» 9 лістапада правяла перформанс з патрабаваннем перайменавання адной са сталічных магістраляў у вуліцу Быкава.**

# Беларус перамог на фотаконкурсе National Geographic

## Здымак беларуса Алега Грыцкевіча «Перапаўненне святых вод» прызнаны найлепшым.

Фота было зроблена з балкона ў часе паводкі ў Індыі ў жніўні 2009 года.

«Гэта верх затопленага ў час паводкі індуісцкага храма ў святарным індыйскім горадзе Варанасі. Я здымаў з балкона гатэля са штатыва з вытрымкай 30 секунд, — патлумачыў аўтар для сайта фатографаў Znyata.by. — На малой вытрымцы ў гэтай хуткай рацэ быў бы бачны попел, вянкі, смецце і парэшткі не да канца спаленых былых жывых істотаў. За 50 метраў справа ад храма знаходзіцца Манікарніка Гхат — галоўнае месца на рацэ Ганг для крэмацыі памерлых».

38-гадовы Алег Грыцкевіч — заўзяты турыст і альпініст. Аб'ехаў паўсвету — ад Тыбета да Тайланда.

На бацькаўшчыне ж ён выдае рэкламна-інфармацыйную газету «Полесье своими глазами».

**Мікола Бугай**






**Рэжысёр Эмір Кустурыца хоча жыць пры салодкай дыктатуры. Старонка 11.**



**Палепшаны «Тытанік»? Allure of the Seas — адзін з двух самых вялікіх круізных лайнераў у свеце — пераплыў Атлантыку. Гіганцкі карабель разлічаны на 6318 пасажыраў і 2000 членаў экіпажу.**

## Анекдоты

* * *

Калі я ведаю, што нічога не ведаю, — то як я пра гэта ведаю?

* * *

Ёсць рэчы важнейшыя за грошы. Дзякуючы інфляцыі.

* * *

Няма сэнсу хаваць вагу, калі не можаш схаваць узрост.

* * *

— А абвесткі ў газетах даюць вынікі?

— Вядома! У панядзелак мы надрукавалі абвестку, што шукаем вартаўніка, а ўжо ў сераду нас абрабавалі!

* * *

— Любая, я затрымліваюся, у заторы стаю.

— У дзве гадзіны ночы? Ану пабібікай..

* * *

Парада медыкаў. Сілкуйцеся аднастайна! Чым больш на вашым стале будзе прадуктаў, тым цяжэй потым паставіць дыягназ атручвання.

## «НН» сто гадоў з вамі

**На катаргу за забойства лісіцы.** Памешчыка Мазырскага павета, 65-гадовага дзеда Кнабельсдрофа, асудзілі на катаргу за забіццё лісіцы ў старой праваслаўнай каплічцы пад лесам. Сяляне трох вёсак, суседніх з дваром Кнабельсдорфа, падалі на Царскае імя прашэнне аб памілаванні асуджанага, які заўсёды памагаў сялянам.

**«НН» №43. 1910.**

**Лукашэнка дзякуе ФСБ.** Падчас гутаркі з Сяргеем Лебедзевым, дырэктарам Федэральнае службы замежнае выведкі Расеі, Лукашэнка падзякаваў яму за «аналітычныя і аператыўныя матэрыялы, якія рэгулярна паступаюць з Масквы» і «дазваляюць спакойна перажыць самыя сур'ёзныя падзеі». Лебедзеў сумеўся: паводле расейскіх законаў, Лебедзеў мае права дакладаць адно Пуціну. У Расеі гэтая заява Лукашэнкі выклікала скандал.

**«НН» №46.2000.**

**Адказы да старонкі 15:** 1) 3; 2) 5.

Наша Ніва
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6410.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 16.11.2010.
Замова № 5573.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9 771819 161008 10043